ЛІТАРАТУРА і мастацтва



2 снежня 2005 г. № 48/4335

АНОНС!

"Залаты шлягер-2005 у Магілёве" толькі-толькі пачынаўся, а ў святочнай атмасферы ўжо луналі дзелавыя прапановы: зрабіць фестываль, як раней, штогадовым і больш працяглым, вярнуць у яго праграму конкурс маладых выканаўцаў... СТАР. 10

У кастрычніку 1992 года кіраўнікамі васьмі краін — Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана і Узбекістана было падпісана Пагадненне аб стварэнні Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі "Мир". Так на постсавецкай прасторы нарадзілася унікальная інфармацыйная структура, якая павінна была прадстаўляць інтарэсы ўсіх яе ўдзельнікаў і забяспечыць права кожнай з незалежных дзяржаў на аб'ектыўную інфармацыю аб жыцці сваіх народаў, культуры, нацыянальных і рэлігійных звычаях.

СТАР. 13

Планета «Лістапад»

Адкрылі, а дакладней будзе сказаць — вынайшлі гэтую планету мінчукі. Сотні, сотні сталічных жыхароў, размыкаючы кола ўласных будняў, патрапляюць на яе арбіту і робяцца палоннікамі іншай рэальнасці, у якой дзівосным чынам люструецца жыццё з яго агульначалавечымі праблемамі. На гэтай планеце ўсё ўладкавана па-зямному — праўда, краіны ды кантыненты прадстаўлены фільмамі, мора вакол іх стварае глядацкая любоў, хвалі зыходзяць ад эмоцый, а небасхіл ззяе ўсмешкамі кіназорак. Тут заўжды камфортна і сонечна, а традыцыйныя лаўры, якімі прынята ганараваць куміраў, маюць адмысловую форму прыгожага кляновага лісця: залатога, срэбнага, бронзавага... Такая "астранамічная з'ява" здараецца раз на год, у апошні восеньскі тыдзень. Адсюль і назва. І хаця сёлета прырода нібы пажартавала, падмяніўшы ліставей зімовай завірухай, цёплы клімат планеты "Лістапад" ад гэтага не пацярпеў. Наадварот. Заўважана, што атмасферу сёлетняга, ужо дванаццатага, Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад" расквеціла-ўзбагаціла вясёлка новых уражанняў і эстэтычных адкрыццяў.

(Працяг на стар.3).

Фота А.Дзмітрыева
Калаж В.Калініна

З 21 па 24 лістапада ў горадзе Кіраў РФ прайшлі мерапрыемствы Міжнароднага форуму культуры Расіі і Беларусі "Вяцкі вянок". Ад Міністэрства інфармацыі нашай краіны ў іх бралі ўдзел галоўны рэдактар часопіса "Нёман" Н. Чайка (кіраўнік дэлегацыі), галоўны рэдактар выдавецтва "Мастацкая літаратура" В. Праўдзін, галоўны рэдактар тыднёвіка "Літаратура і мастацтва" А. Казлоў, паэт і перакладчык Я. Каршукоў. Міністэрства культуры прадстаўлялі кампазітар, старшыня Беларускага таварыства сучаснай музыкі Д. Лыбін, кампазітар А. Безэнсон, салістка Белдзяржфілармоніі, лаўрэат Міжнароднага конкурсу імя Шаляпіна С. Старадзетка, выканаўца на беларускіх цымбалах, лаўрэат міжнародных конкурсаў, выкладчык Мінскай ДМШ № 10 імя Я. Глебава Т. Краснабаева. З расійскага боку на форуме прысутнічалі празаік, першы сакратар Саюза Расійскіх пісьменнікаў С. Васіленка, паэт, член праўлення СРП Г. Умывакіна, паэт Ю. Кубланоўскі, празаікі Ю. Пяткевіч, Ю. Панчанка (старшыня Кіраўскага рэгіянальнага аддзялення СРП). А таксама шырокавядомыя кампазітары Я. Дога, Ш. Чалаеў, У. Казенін, А. Іваноў, А. Колкер, спевакі М. Пахоменка, В. Аліеў, І. Дзельская.
Міжнародны форум культуры Расіі і Беларусі "Вяцкі вянок" праводзіўся па ініцыятыве рэгіянальнага савета Кіраўскай вобласці Саюзнай грамадскай палаты "Беларусь—Расія" сумесна з саюзамі кампазітараў, саюзамі пісьменнікаў абодвух бакоў.

СУСТРЭЧА ДАЎНІХ СЯБРОЎ

НАМ ПАДАБАЮЦЦА АДНЫ І ТЫЯ Ж ПЕСНІ

Познім вечарам 20 лістапада на чыгуначным вакзале г. Кірава з цягніка "Брэст—Новасібірск" гасцей сустракалі з хлебам-соллю мясцовыя прадстаўнікі культуры і літаратуры. Пісьменніца Н. Русінава, ветліва ўсміхаючыся, запрасіла беларусаў паспытаць свежаспечанага вяцкага каравая. Ён і сапраўды быў смачны і духмяны, з залацістай хрумсткай скарынкаю.

На наступны дзень у Кіраўскім драматычным тэатры адбылося ўрачыстае адкрыццё форуму. З прывітальным словам да гасцей і перапоўненай залы звярнуліся галоўны федэральны інспектар па Кіраўскай вобласці Валянцін Пугач, намеснік губернатара Аляксандр Галіцкіх, сустаршыня рэгіянальнага савета Кіраўскай вобласці Саюзнай грамадскай палаты "Беларусь—Расія" Алег Валянчук, які, у прыватнасці, сказаў: "Нашы народы спакон веку былі разам, пагэтаму мы вырашылі, што і тут, на Вяцкай зямлі, мы не павінны стаяць убаку ад працэсаў аб'яднання дзвюх дзяржаў. Бо не толькі палітыкі могуць садзейнічаць збліжэнню народаў. Рэальнаму аб'яднанню людзей у няменшай ступені спрыяюць творчыя асобы, дзеячы культуры".

Кіраўнік нашай дэлегацыі Ніна Чайка падзякавала кіраўчанам за сяброўскі цёплы прыём і падкрэсліла: "Тое, што зрабіла Вятка (да 1934 года г. Кіраў называўся Вяткай), — гэта пачатак аб'яднання двух народаў".

Галоўны федэральны інспектар па Кіраўскай вобласці Валянцін Пугач адзначыў, што "міжнародны дыялог — гэта не толькі кантакты і сяброўскія стасункі кіраўнікоў дзяржаў, але і культурнае ўзаемадзеянне народаў. Мы гатовы паказаць вам, як жывём, нічога не прыхоўваючы".

Намеснік губернатара Кіраўскай вобласці Аляксандр Галіцкіх выказаў надзею, што "форум зможа падараваць усім незабыўныя сустрэчы з лепшымі музычнымі і літаратурнымі творамі, напрацаванымі за апошні час у двух брацкіх народаў".

Ад беларускай дэлегацыі ў гонар 60-годдзя Перамогі Віктар Праўдзін падараваў арганізатарам форуму кнігі "1418 дзён вайны", "Памяць са слязамі на вачах", выданні РВУ "Літаратура і Мастацтва", кнігу "Уладзімір Мулявін". Менавіта апошняя з іх увайшла ў сотню лепшых кніг свету. Трэба адзначыць, што ў зале было шмат ветэранаў, як рускіх, так і беларусаў. Яны падчас

вайны змагаліся з ворагам плячо ў плячо, набліжаючы нашу агульную Перамогу.

Урачыстую частку мерапрыемства завяршылі дзяржаўныя гімны Расіі і Беларусі. Затым пачаўся святочны канцэрт, у якім уперамежку гучалі народныя рускія ды беларускія мелодыі, усімі любімыя песні "Сяброў", "Песняроў", творы кампазітараў Дзмітрыя Лыбіна, Яўгена Догі, Уладзіслава Казеніна, Алега Іванова, Аляксандра Колкера, Аліны Безэнсон, Андрэя Карпікава, Ілы Гараднічага.

Вяцкі муніцыпальны аркестр рускіх народных інструментаў імя Фёдара Шаляпіна (мастацкі кіраўнік — заслужаны дзеяч мастацтваў Сяргей Галушка; дырыжор Аляксандр Чубараў) выканаў творы Глінкі, Шастаковіча, Дунаеўскага, народныя напевы.

* * *

Наступныя дні форуму былі вельмі насычанымі і багатымі на сустрэчы для беларускай дэлегацыі. Мінчане наведалі майстэрні і музей "Народны мастацкі промысел "Дымкаўская цацка". Гэта унікальная з'ява ў рускім народным мастацтве. У чырванашчокіх паненках, няньках, зухаватых конніках, сцэнках піцця чаю, кірмашах з каруселямі працягваюць жыццё і сёння чатырохсотгадовыя традыцыі дымкаўскага промыслу. І цяпер вырабы мясцовых майстрых вядомыя далёка за межамі Расіі. Гліняныя творы мастацтва З. Пенкінай, А. Копкінай, А. Канавалавай, зробленыя ў пазамінулым стагоддзі, годна выглядаюць у музейнай экспазіцыі.

Старшыня рэгіянальнага аддзялення Саюза мастакоў Уладзімір Мулін правёў для дэлегацыі экскурсіі па выставах, пазнаёміў з вядучымі мастакамі горада. Затым госці наведалі Новавяцкую школу-інтэрнат, Слабодскую дзіцячую музычную школу імя П. Чайкоўскага. І паўсюль з захапленнем і замілаваннем жыхары вяцкай зямлі прымалі беларускія песні ў выкананні непаўторнай Святланы Старадзеткі, стаіўшы дыханне слухалі меладычныя беларускія цымбалы, на якіх віртуозна грала наша Таццяна Краснабаева.

У Кіраўскім педагагічным універсітэце адбылася дыскусія "Роля творчасці ў жыцці грамадства і дзяржавы", а ў чытальнай зале бібліятэкі імя Герцэна прайшоў вялікі літаратурны вечар з удзелам рускіх і беларускіх пісьменнікаў. Паслухаць і пабачыць землякоў прыйшло шмат беларусаў, якія даўно жывуць у Вятцы і тамтэйшай вобласці.

Многія прыехалі на сустрэчу за дзесяткі кіламетраў. Іх цікавіла ўсё, да драбніц, што адбываецца на Радзіме. Адчуваўся недахоп інфармацыі пра нашу краіну.

Літаратурная вечарына доўжылася каля трох гадзін. Госці адказалі на шматлікія пытанні, вялікая колькасць запісак засталася на памяць мінчанам. Як бы далёка ні жылі нашы землякі, але іх хвалюе лёс роднай мовы, літаратуры. І што дзіўна: знаходзячыся па дваццаць і больш гадоў у няблізкім Кіраве, нашы людзі не забыліся на матчына слова. Яскравы прыклад таго запіска Юлі Васільеўны Пракашавай: *"Дзякуй вам, што прыехалі да нас! Дзякуй, што выконваеце запавет Багушэвіча, які наказваў: "не пакідайце нашу мову беларускую, каб не ўмерці". Хай беларусы нясуць на сваіх плячах не крыўду, а сонца жыцця і перамог. Няхай любоў да Радзімы жыве ў сэрцах незалежна ад таго, дзе чалавек знаходзіцца. Яшчэ раз дзякуй за светлыя хвіліны сустрэчы".*

Юля Васільеўна асталявалася ў Кіраве сорак пяць год таму, і нягледзячы на гэта ў запісцы няма аніводнай памылкі.

Надоўга застануцца ў памяці ўсіх і майстар-класы кампазітараў у дзіцячых школах мастацтваў, дзіцячай філармоніі. А колькі шчырасці і цеплыні адчулі госці падчас наведвання Дома ветэранаў і сустрэчы з былымі салдатамі, афіцэрамі, медыцынскімі сёстрамі. Такое не забываецца! Многія з тых, хто прыйшоў на сустрэчу, вызвалялі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і таму лічаць "зямлю пад белымі крыламі" сваёй другой Радзімай. Васьмідзесяцігадовыя пераможцы прыгадвалі песні і вершы на нашай мове, цікавіліся жыццём беларускіх ветэранаў, перадавалі ім сардэчныя прывітанні.

"Мы ніколі не былі і не будзем раз'яднаныя, у нас адна агульная Перамога. Мы браты па крыві і духу", — лейтматывам гучала ў кожным выступленні ветэранаў.

Па выніках мерапрыемстваў Міжнароднага форуму культуры Расіі і Беларусі "Вяцкі вянок", яго ўдзельнікі падпісалі зварот да народаў Расіі і Беларусі, Прэзідэнтаў з дзвюх краін.

* * *

24 лістапада адбылося ўрачыстае закрыццё форуму ў Кіраўскай абласной філармоніі. У перапоўненай зале зноў гучалі беларускія і рускія народныя песні ды мелодыі, творы кампазітараў. Месца хапала для беларускага і рускага слова. І нічога дзіўнага, што падчас размоў не патрэбны быў перакладчык, бо ў сваёй культуры нашы народы не раз'яднаныя: усе мы славяне, таму з разуменнем і павагай адносімся адно да аднаго.

А. СМАЛЯК

Фота Н. Цімафеевай

Кіраў—Мінск

ПТУШКІ АДНАГО ГНЯЗДА

Дэкада ўрачыстых падзей, прымеркаваных да 60-годдзя заснавання Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, завяршылася юбілейнай вечарынай у сталічнай філармоніі. Фае аздобілі работы студэнтаў мастацкага факультэта ды факультэта дызайна і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Канцэртную праграму — вакальныя нумары, танцы, пластычныя эцюды, музычныя пародыі ў выкананні будучых акцёраў ды рэжысёраў, а таксама колішніх гадаванцаў акадэміі, гасцей імпрэзы.

Пачыналася ж вечарына афіцыйнай цырымоніяй. Грунтоўны даклад рэктара БДАМ, прафесара Р.Смольскага. Выступленне міністра культуры Беларусі Л. Гулякі: ён выканаў даручэнне кіраўніка нашай дзяржавы і зачытаў віншавальнае слова Прэзідэнта А. Лукашэнкі з нагоды юбілею акадэміі, якая выконвае важную місію сучаснага цэнтра падрыхтоўкі кадраў, захоўвае вернасць ідэалам праўды, дабрыні, прыгажосці і выхаванцы якой маюць поспехі на міжнародных фестывалях, выстаўках, конкурсах. Многія выдатныя педагогі атрымалі ў той вечар пачэсныя ўрадавыя ўзнагароды, Ганаровыя граматы і каштоўныя падарункі ад розных міністэрстваў і ведамстваў. Прагучала прывітанне ад мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі, зачытанае пратаіерэем Ф. Поўным.

Калектыў акадэміі віншавалі калегі па творчасці ды выпускнікі — вядомыя артысты, выкладчыкі. Асабліва кранальна выступіла "дэлегацыя" Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы, які адзначае і свой юбілей — 85, а ў творчым складзе мае 60 (!) выпускнікоў альма-матэр. Мастацкі кіраўнік В. Раеўскі вымаўляў іх знакамітыя імёны — і на сцэну выходзілі прадстаўнікі розных творчых пакаленняў. На жаль, многія выдатныя купалаўцы не дажылі да гэтага двайнога юбілею... Слушна заўважыў генеральны дырэктар тэатра, акцёр М. Кірычэнка: важна не тое, хто ў якім годзе скончыў родную альма-матэр і як яна тады называлася — інстытутам ці акадэміяй; не тое, хто якіх вышынь дасягнуў, якім званнем ганараваны або не мае яго зусім, — "важна, што ўсе мы — птушкі аднаго гнязда".

Сёння тут "становіцца на крыло" і рыхтуецца да самастойных палётаў даравітая артыстычная моладзь. Засвойваючы ўрокі старэйшых калег і лепшыя традыцыі сваіх папярэднікаў, яна імкнецца да новых творчых адкрыццяў.

С. ВЕТКА

Фота К. ДРОБАВА

Планета «Лістапад»

(Працяг. Пачатак на стар.1)

Кожны, каму пашчасціла спрычыніцца да жыцця на планеце "Лістапад" (са спадарожнікам-"Лістападзікам"), знайшоў тут і духоўную прастору, сугучную свайму ўнутранаму свету, і сваю, скажам так, тэрыторыю. Стужкі, што спаборнічалі за лаўры пераможцаў ці дэманстраваліся па-за конкурсам, адлюстравалі набыткі ды пошукі сённяшняга сусветнага кінематографа: ад Японіі да Швецыі, ад Германіі да Узбекістана, ад Арменіі да Польшчы, ад Ірана да Сербіі, ад Казахстана да ЗША, ад Латвіі да Украіны... "Лістапад-2005" прыпаў на Год культуры Расійскай Федэрацыі ў нашай краіне, і складальнікі фестывальнай праграмы засяродзілі ўвагу на гэтай падзеі. Напрыклад, у сталічным кінатэатры "Цэнтральны" прайшла праграма самых новых расійскіх фільмаў: "Заказ", дзе ў якасці рэжысёра выступіла вядомая актрыса В.Глаголева, "Коля — перакаці-поле" М. Дасталя, "Аддалены доступ" С. Праскурынай, "Бедныя родзічы" П. Лунгіна. І яшчэ — "Не хлебам адным" С. Гаварухіна: гэтая стужка ўдзельнічала таксама ў конкурсным паказе і атрымала галоўны прыз...

Дарэчы, пра ўзнагароды. Самую першую з іх, і яшчэ падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця фестывалю, атрымаў старэйшына расійскага кіно Пётр Тадароўскі, якому сёлета споўнілася 80: Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў яго спецыяльным прызам "За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве". А падчас урачыстага падвядзення вынікаў "Лістапада—2005" спецыяльным прызам кіраўніка нашай дзяржавы "За духоўнасць і гуманізм у кіно" быў ганараваны расійскі рэжысёр, сцэнарыст, акцёр, дзяржаўны дзеяч, стваральнік фільма "Не хлебам адным" Станіслаў Гаварухін. Яму таксама быў уручаны Ганаровы нагрудны знак Міністэрства культуры Беларусі. А яго работу, паказаную на конкурсе, глядацкае журы на чале з прафесарам Р. Смольскім вызначыла як фільм-фаварыт і прысудзіла Гран-пры, дыплом і прыз глядацкіх сімпатый "Золата "Лістапада". "Срэбрам "Лістапада" гледачы адзначылі прадстаўленую Украінай карціну Кіры Муратавай "Настройшчык". "Бронза" дасталася сербскай стужцы "Сон у зімовую ноч" — між іншым, яе стваральнік, рэжысёр Горан Паскалевіч уваходзіць сёння ў дзесятку лепшых кінарэжысёраў свету.

Што ж сказала наконт сёлетняй конкурснай праграмы прафесійнае журы кінематаграфістаў, якое ўзначальваў расійскі рэжысёр і акцёр С.Урсуляк? Прыз за лепшую рэжысуру строгія суддзі мусілі падзяліць між двума калегамі: сербам Горанам Паскалевічам ("Сон у зімовую ноч") ды прадстаўніком новай генерацыі нямецкіх майстроў экрана Маркам Ротэмундам ("Сафі Шоль — апошнія дні"). Быў адзначаны шэраг спецыялістаў у розных намінацыях. Дыплом і спецпрыз Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі "За вернасць маральным ідэалам у кінамастацтве" атрымаў папулярны расійскі акцёр Аляксандр Міхайлаў. А вось журы кінапрэсы на чале са стваральнікам вядомых тэлепраектаў А. Лукашэвічам свой спецыяльны прыз уручыла сусветна прызнанаму рэжысёру, лаўрэату многіх прэстыжных кінафестываляў Кшыштафу Занусі. Знакаміты дзеяч польскага мастацтва прадставіў у Мінску сваю новую стужку "Персона Non Grata".

Падчас фестывальнага тыдня на планеце "Лістапад" можна было сустрэць дзесяткі зорак экрана і адкрыць для сябе іскрынкі новых талентаў, паглядзеўшы праграму работ студэнтаў ВГІКа. Можна было завітаць і на юбілейную імпрэзу, прысвечаную 25-годдзю Мінскага тэатра-студыі кінаакцёра...

Урэшце менавіта глядач — галоўны спажывец, галоўны крытык і галоўны суддзя. Арганізатары "Лістапада" нездарма падкрэсліваюць, што дзеля гледача і ладзіцца гэты фестываль. І, як зазначыў нязменны прэзідэнт мінскага кінафоруму Расціслаў Янкоўскі, фестываль з кожным годам робіцца больш сур'ёзны, больш разумны і больш цікавы, а з ім — і глядач...

Я. КАРЛІМА

«Прэса-2006»

Дзень беларускіх і саюзных СМІ, арганізаваны Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь, прайшоў 23 лістапада ў рамках 13-й Міжнароднай прафесійнай выставы "Прэса-2006", якая ладзілася ў расійскай сталіцы.

Сёлета ў гэтым форуме наша краіна ўдзельнічала ў якасці ганаровага госця.

Падчас свята беларускіх і саюзных СМІ адбылася прэзентацыя нацыянальнага стэнда "Сродкі масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь", пасяджэнне прэс-клуба на тэму "Беларусь і Расія на шляху ўзаемапаразумення. Патэнцыял інфармацыйнага супрацоўніцтва ў развіцці эканамічных і сацыяльна-культурных адносін" і іншыя мерапрыемствы.

Усяго ж у выставе "Прэса-2006" узялі ўдзел 10 тысяч журналістаў, паліграфістаў, распаўсюджвальнікаў друку, рэкламных агенцтваў з рэгіёнаў Расіі і краін СНД. Былі прадстаўлены больш як тысяча газет і часопісаў, а таксама электронных СМІ.

Іна ЛАЗАРАВА

Справы музейныя

Змяненні і дапаўненні ў Закон "Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь" зацверджаны на мінулым тыдні Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу РБ.

— Гэта стала неабходным з-за наяўнасці юрыдычных калізій і супярэчнасцей паміж узгаданым Законам, які быў прыняты яшчэ ў 1996 годзе, і новай рэдакцыяй праекта Закона "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь", а таксама іншымі, больш свежымі, нарматыўнымі прававымі актамі, — патлумачыў падчас пасяджэння сесіі старшыня Пастаяннай камісіі па сацыяльнай сферы Анатоль Новікаў.

Новыя палажэнні распрацаваны з улікам галоўных кірункаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне музейнай справы. Яны прадугледжваюць даступнасць музейных каштоўнасцей, парадак утварэння і ліквідацыі ўстаноў, крыніцы фінансавання.

Інеса ПЕТРУСЕВІЧ

КУДЫ ПАДЗЕЛІСЯ ПАДРУЧНІКІ?..

Добры дзень, паважаныя супрацоўнікі газеты "Літаратура і мастацтва"!

Да вас звяртаюцца настаўнікі беларускай мовы і літаратуры Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Аб'ектам нашага клопату з'яўляецца далейшы лёс **праграмы, падручнікаў і навукова-метадычнага комплексу па беларускай літаратуры** для 5—12-ых класаў сярэдняй агульнаадукацыйнай школы, якія выдатна распрацаваны аўтарскім калектывам Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна пад навуковым кіраўніцтвам і рэдакцыяй кандыдата педагагічных навук, прафесара, члена-карэспандэнта НАН Беларусі Веры Якаўлеўны Ляшук (Зарэцкай).

Настаўніцтва рэспублікі ўжо больш як дзесяць гадоў (да жніўня 2004 г.) мела цвёрдае права выбару выкладаць родную літаратуру сваім выхаванцам паводле дзвюх дзеючых праграм — Нацыянальнага інстытута адукацыі і Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта. Было выкарыстана шмат дзяржаўных фінансавых сродкаў, спатрэбілася нямала фізічных і маральных сіл саміх навукоўцаў, выдаўцоў, каб падрыхтаваць багаты навукова-метадычны комплекс практычна для кожнага класа. Настаўнікамі краіны ўжо набыты перадавы педагагічны вопыт выкладання, пра што сведчаць старонкі прафесійных часопісаў "Роднае слова" і "Беларуская мова і літаратура". І ў выніку — Міністэрства адукацыі без ніякіх тлумачэнняў і каментарыяў прапануе ажыццявіць пераход на выкладанне па падручніках Нацыянальнага інстытута адукацыі (?), *а праграмы па беларускай літаратуры Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта "выкарыстоўваць толькі ў класах устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з 11-гадовым тэрмінам навучання."* (Інструктыўна-метадычнае пісьмо "Аб выкладанні беларускай мовы і літаратуры ў 2004/2005 навучальным годзе", "Настаўніцкая газета" за 17 ліпеня 2004 года.) А гэта значыць, што праз некалькі навучальных гадоў вывучэнне літаратуры ў 5—12-ых класах па паралельных падручніках брэсцкіх вучоных закончыцца.

Безумоўна, напрошваюцца пытанні: ці па-гаспадарску аднесліся нашы чыноўнікі да дзяржаўных фінансавых сродкаў? **Чаму з боку Міністэрства адукацыі такі адмоўны неаргументаваны падыход да тытанічнай і выдатнай працы нашых землякоў з Брэста? Чаму настаўнікі матэматыкі, фізікі маюць больш як тры праграмы і паралельныя падручнікі па сваіх прадметах?** А калегі-філолагі польскай мовы ў суседняй Польшчы карыстаюцца і ганарацца дзесяткамі дапаможнікаў практычна ў кожным класе. Нам хацелася б даведацца, **куды падзеліся падручнікі брэсцкага калектыву вучоных для 9-га і 10-га класаў, якія пяць гадоў таму занялі прызавыя месцы і атрымалі ўзнагароды ў рэспубліканскім конкурсе "Падручнік года ў сацыяльна-гуманітарнай сферы"?**



З падобным пісьмом-просьбай настаўнікі Брэсцкчыны ўжо звярталіся ў Міністэрства адукацыі. Быў атрыманы адказ (змест яго дадаецца)

У сувязі з Вашым пісьмом упраўленне агульнай сярэдняй адукацыі паведамляе наступнае.

Рашэнне аб аб'яднанні дзвюх праграм па беларускай літаратуры і стварэнні на іх аснове адной праграмы для агульнаадукацыйных школ з 12-гадовым тэрмінам навучання прынята міністрам адукацыі падчас пасяджэння Дзяржаўнай камісіі па падрыхтоўцы новых падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў у грамадска-гуманітарнай сферы.

Начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі У.К. Шчэрба

Значыць, ужо створаны вышэй названымі двума аўтарскімі калектывамі сумесная адзіная праграма і падручнікі.

Педагагічная грамадскасць чакае вынікі іх працы ўжо два гады. На жаль, і да сённяшняга дня няма ні праграмы, ні падручнікаў, ніякага каментарыя і наогул ніякай інфармацыі ў перыядычным друку наконт гэтага праекта.

Нам хацелася б прыцягнуць вашу ўвагу да гэтай **дзяржаўнай праблемы,** пачуць ад вас грунтоўны адказ на вышэй пастаўленыя пытанні і ўсё ж задаволіць нашу просьбу — каб **навукова-метадычны комплекс па беларускай літаратуры таленавітых вучоных з Брэсцкага універсітэта заняў пачэснае месца на беларускай педагагічнай ніве, радаваў дзяцей, бацькоў і настаўнікаў нашай краіны.**

Калі глядзіш па тэлебачанні перадачы пра нашу сельскую гаспадарку, пра стварэнне аграгарадкоў, пра тую руплівасць, што Прэзідэнт праяўляе да вёскі, дык інакш як абнаўленне такое становішча і не назавеш. А па-іншаму і быць не можа. Стороннія назіральнікі і людзі, якія прыязджаюць у Беларусь, і тыя, хто жыве тут стала, адзначаюць кемлівасць і працавітасць нашага народа ды прадказваюць яму светлую будучыню.

БЕЛАРУСЬ — ДЗЯРЖАВА еўрапейская

На скрыжаванні

Для таго, каб стваральная праца суайчыннікаў стала плённаю, ёсць усе перадумовы. Перш за ўсё гэта закладзены папярэднімі пакаленнямі падмурак нашай дзяржаўнасці, пабудаваныя заводы і фабрыкі, навукаёмкія тэхналогіі і навуковыя цэнтры. Спадкаемцы "пана сахі ды касы" аказаліся дастаткова разумнымі, каб задаволіць патрабаванні тэхнічнага прагрэсу.

Ёсць яшчэ адна галіна ўзбагачэння дзяржавы. Пра яе ўсе ведаюць, пра яе многа гавораць, але, на маю думку, недастаткова робяць, каб узяць тыя велізарныя, у маштабах краіны, грошы, якімі пакуль што карыстаюцца іншыя. Гэта — турызм. І ў першую чаргу для замежнікаў, так званы ўязны.

Можа, мае звесткі спазніліся, але яшчэ год таму прыбыткі ад турызму складалі ў нас усяго 0,1 працента ад дзяржаўнага бюджэту. Параўнайце: у Ізраілі, Швейцарыі, Фінляндыі гэтыя лічбы вылічаюцца ледзь не ў палову бюджэту. А ў некаторых краінах толькі з такой дзейнасці людзі і жывуць.

Так, у нас недастаткова пакуль што развітая адпаведная інфраструктура для таго, каб задаволіць патрабаванні тых, хто захоча прывезці сюды свае долары ды еўра. Мала ў Беларусі шматзоркавых атэляў. Але ёсць створаныя для сапраўднага турыстычнага бізнесу перадумовы. Гэта айчынная архітэктура — па разнастайнасці і багацці яе стыляў з намі наўрад ці можа параўнацца хто-небудзь у свеце.

Вядома ж, у беларускай архітэктуры адлюстравалася наша складаная гісторыя.

Беларусь знаходзіцца на перакрыжаванні шляхоў з Захаду на Усход і з Поўначы на Поўдзень. Ніводная вайна не мінула нашу зямлю на працягу многіх стагоддзяў. Таму многія пабудовы, асабліва гэта датычыць замкаў, носяць абарончы характар. Абаранялісь беларусы з Поўдня ад татар і будавалі Слонімскія ды Слуцкія замкі, змагаліся з тэўтонамі і ўзводзілі цэлыя паясы велічных збудаванняў, такіх, як Навагрудскі, Лідскі, Крэўскі, Трокскі замкі. Нават касцёлы ды цэрквы прыстасоўваліся да патрэб абароны і, на шчасце, зберагліся такія пярліны нашай архітэктуры, як Камайскі абарончы касцёл і дзве самыя прыгожыя на Беларусі праваслаўныя царквы абарончага тыпу — Сынковіцкая ды Маламажэйкаўская (Мураванкаўская).

Пазней, калі змрочнае сярэднявечча пачало страчваць сваё ўздзеянне на грамадства, у часы, якія прынята называць "рэнесанснымі", пачалі будаваць Мірскі замак. Гэтую падзею адносяць да 1510 года. Шмат разоў ворагі спрабавалі разбурыць яго, падчас другой сусветнай вайны ў двары замка гітлераўцы нават зрабілі яўрэйскае гета, але Мірскі замак ацалеў. У 2002 годзе ЮНЕСКА залічыла яго у Спіс сусветнай прыроднай і культурнай спадчыны, выдзеліла на рэстаўрацыю грошы, і цяпер ён з кожным годам робіцца ўсё прыгажэйшым.

У дванаццаці кіламетрах ад Міра знаходзіцца другі шэдэўр беларускага дойлідства — Нясвіжскі замак, родавае гняздо ўсходнееўрапейскіх магнатаў Радзівілаў. І першапачатковая назва ў яго была — Замір'е. Нібы нехта хацеў падкрэсліць, што ў параўнанні з Мірскім замкам Нясвіжскі — малодшы брат. Але ж горад, што Радзівілы пабудавалі побач са сваім "гняздом", — таксама цуд архітэктуры. Тут і фарны касцёл, і Слуцкая брама, і ратуша, і амаль кожны стары дом — помнік дойлідства.

«Мястэчка» азначае «маленькі горад»

Зусім нядаўна некаторыя афіцыйныя асобы саромеліся слова "мястэчка" і стараліся выкінуць яго з ужытку. Мусіць, для некаторых ураджэнцаў такіх паселішчаў, як Моталь, Бярэзіна, Лыскава, Янавічы слова "местачковец" здавалася абразлівым, было сімвалам правінцыйнасці і занядбанасці. А між тым у нашых мястэчках нарадзіліся многія дзеячы міжнароднага руху. Цяпер пра беларускія мястэчкі пішуць кнігі, ім адводзіцца ў беларускай гісторыі належнае месца. Член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар архітэктуры і доктар гістарычных навук, прафесар А. Лакотка ў сваёй манаграфіі "Архітэктурная спадчына Беларусі" зазначае, што яшчэ ў XVI стагоддзі на Беларусі было 210 мястэчак. Ажно да XX стагоддзя яны з'яўляліся гандлёвымі цэнтрамі і размяшчаліся побач з замкамі, палацамі, касцёламі, манастырамі. Абавязковая прыналежнасць кожнага — рынкавая плошча.

З прыходам савецкай улады многія падобныя паселішчы змянілі свой адміністрацыйны статус і зрабіліся раённымі цэнтрамі. Іншыя, асабліва тыя, дзе не было прамысловасці і працоўных месцаў, ператварыліся ў звычайныя вёскі. Узнікла неабходнасць рэгенерацыі цэлых рэгіёнаў. А. І. Лакотка прапануе сваю канцэпцыю, сутнасць якой у адраджэнні малых паселішчаў. Паўсюль, і ў Ракаве, і ў Лынтупах, і ў Лыскаве ды Суражы Віцебскай вобласці, ёсць старыя пабудовы, якія ў сённяшніх рынкавых зносінах можна прыстасаваць пад майстэрні, гандлёвыя кропкі... Там нямала і помнікаў архітэктуры рэспубліканскага значэння, іншых аб'ектаў гістарычнай спадчыны. Пераўтварэнне мястэчак у апорныя кропкі "лакальнай інфраструктуры турызму і мясцовай краязнаўча-асветніцкай дзейнасці" будзе спрыяць пераўтварэнню ўсяго знешняга аблічча Беларусі, захаванню і рэстаўрацыі яе помнікаў, а таксама адраджэнню многіх традыцыйных рамёстваў і стварэнню новых працоўных месцаў.

У многіх нашых гарадах і мястэчках захаваліся цудоўныя паркі. Адны з іх даглядаюцца старанна, і туды не соромна прывесці якую заўгодна VIP-асобу. Гэта і ў Нясвіжы, і ў Гомелі. Ёсць вялікія комплексы, што існуюць дзякуючы сельскагаспадарчым ліцэям: напрыклад, Жыліцкі парк, што ў Кіраўскім раёне. А вось Манькавіцкага, што ў Століне, ды Жамыслаўскага, у Іў'еўскім раёне, шкада, бо хоць яны і не знішчаны, але і руплівага гаспадара тут няма. Толькі вялікіх палацава-паркавых комплексаў у нас не менш як паўтара дзесятка: сярод іх Свяцкі ў Гродзенскім раёне, Радзівілімонтаўскі ў в.Чырвоная Зорка Клецкага раёна, Сноўскі ў Нясвіжскім, Паланэчкаўскі ў Баранавіцкім краі... Хіба ж гэта не багацце, хіба ж не варта гэтым ганарыцца і зберагаць як свае фамільныя каштоўнасці?

Адначасова хачу зазначыць, і не я першы гэта раблю, што ў нас шмат каштоўных пабудоў, на якія ніхто проста не звяртае ўвагі. Я не ведаю, чаму не даглядаецца дом Рэйтанаў у Грушаўцы Ляхавіцкага раёна? З-за чаго занядбаны выгляд мае панскі дом у Смілавічах? Няўжо не заслугоўвае лепшай долі сядзіба Магдалены Радзівіл у Кухцічах, што ў Уздзенскім раёне, альбо бібліятэка Храптовіча ў Шчорсах Навагрудскага раёна?

Каменныя кветкі вечнасці

З другой паловы XVII стагоддзя на Беларусі пачынаецца і шырока распаўсюджваецца будаўніцтва панскіх сядзіб і палацаў з паркавымі комплексамі рэгулярнага і ландшафтнага характару — адзінкавыя пабудовы магнатаў ды манархаў. А ў XVIII стагоддзі гэтаму працэсу паспрыяў новы архітэктурны стыль — барока. На сённяшні дзень сядзібных дамоў, якія належалі сярэдняй рукі шляхце, захавалася прыблізна 80. У большасці з іх размешчаны школы, бальніцы, сельсаветы. Дзякуючы гэтаму гістарычныя будынкі сяк-так зберагаюцца.

Ёсць сярод былой панскай маёмасці і сапраўдныя палацы: Жыліцкі, Жамыслаўскі, Лявонпальскі, не гаворачы ўжо пра Гомельскі палац Паскевічаў. Частка іх стаіць у разбураным выглядзе — Косаўскі альбо Ружанскі, а такія, як Гальшанскі ды Смалянскі, толькі-толькі ператалі забруджваць.

Першаю каменнаю царквою на Беларусі была Полацкая Сафія, пабудаваная ў XI стагоддзі ў часы праўлення князя Усяслава Брачыслававіча. Потым яна шмат разоў гарэла ў часы войнаў, апошні раз перабудоўвалася ў XVIII стагоддзі вядомым архітэктарам Глаўбіцам і сёння прадстаўляе сабою ўзор позняга барока. У старым Полацку захавалася яшчэ некалькі храмаў, Спаса-Еўфрасіннеўская царква, Багаяўленскі манастыр, касцёл і кляштар бернардзінцаў і шэраг помнікаў архітэктуры, якія складаюць комплекс-аблямоўку Параднай плошчы. Дарэчы, Полацкая школа дойлідства моцна паўздзейнічала на іншыя архітэктурныя школы ў Беларусі.

Наступнаю за Полацкаю ідзе Гродзенская школа. На жаль, захаваўся толькі адзін яе ўзор — Каложская, альбо Барысаглебская царква з галаснікамі, умуравамі ў тоўшчу сцен.

Але і каталіцкія касцёлы, якіх у Гародні нямала, па сваёй архітэктуры адрозніваюцца ад касцёлаў у іншых гарадах: тутэйшае дойлідства больш суровае і нясе на сабе след сярэднявечных абарончых пабудоў.

У Мінску таксама ўзводзілася шмат касцёлаў у XVII-XVIII стагоддзях. Культавыя пабудовы таго часу зроблены выключна ў стылі барока і іх стыль не пераблытаеш з Полацкім, Гродзенскім, Слонімскім, і таму архітэктары слушна ўжываюць тэрмін "Мінскае барока". Ці не ўсе гэтыя храмы пазней пераўтварыліся ў праваслаўныя цэрквы і найбольш прыкметны ўзор такога дойлідства — Мінскі Свята-Духаў кафедральны сабор, які стаў сапраўдным упрыгожваннем нашай сталіцы.

Зразумела, што перш чым з'явілася каменная царква, ёй папярэднічалі драўляныя храмы. Іх ў Беларусі ацалела крыху больш як семдзесят адзінак, толькі тых, якія з'яўляюцца помнікамі рэспубліканскага значэння. Такія цэрквы захаваліся яшчэ ў Жыровічах, у Свіры, у іншых месцах.

Пасля апошняга паздзелу Рэчы Паспалітай для Беларусі пачалася новая эпоха ў грамадскім, сацыяльным і эканамічным развіцці. З часам архітэктура пачала падпарадкоўвацца ўжо расійскай модзе: класіцызм, ампір — тое, што было прынята пры ўзвядзенні памешчыцкіх "сядзіб". Рэзка скараціліся барока і готыка.

* * *

Сённяшняя архітэктура — гэта не толькі асобныя пабудовы, сучасныя дойліды працуюць паводле планаў, якія сягаюць на 20, а то і на 50 гадоў наперад. Яны ствараюць дзіцячыя садкі, транспартныя магістралі, магазіны, банкі, бібліятэкі. Але паміж вялікімі гарадамі і правінцыяй існуюць значныя адрозненні.

На Захадзе, у Германіі, Бельгіі, Галандыі, такога паняцця, як "вёска і горад", няма. У малых паселішчах працуюць розныя дробныя фірмы, звязаныя з аказаннем сервісных паслуг. Калі б мы пайшлі шляхам наладжвання такой інфраструктуры, дык адрадзілі б і нашы малыя паселішчы, і вярнулі б да жыцця старыя пабудовы, стварылі б шмат новых працоўных месцаў. Зрабіць такое можна было б, на маю думку, шляхам прываблівання дробных прадпрымальнікаў у мястэчкі, прадастаўленнем ім пэўных падаткавых ільгот. У кожным разе гэта справа — агульнадзяржаўная, і толькі дзяржава можа выканаць яе ў поўным аб'ёме.

А калі б мы больш шырока пачалі ўжываць у цяперашняй правінцыі звесткі пра нашу мінуўшчыну, пра тое, што вось тут, у Вішневе, працаваў Сымон Будны, а тут, у Латыгалічах, жыў Васіль Цяпінскі, то, можа, і турыстаў з-за мяжы зацікавілі, дый сваю моладзь узбагацілі б інфармацыяй ды адрадзілі б яе гонар за родную мясціну.

Правільна арганізаваны турызм ёсць высокадаходная галіна, якая можа прынесці прыбыткі не меншыя, чым беларускі калій, трактарная і аўтамабільная прамысловасці разам узятыя. Ды яшчэ цалкам пераўтварыць аблічча нашай Радзімы.

Ігар ВАЛАСЕВІЧ

Фота забяспечана аўтарам

Востраў надзеі і чакання

Мабыць, няма ў свеце большага шчасця, чым бачыць, як дзеці растуць, усміхаюцца, робяць першыя крокі, упершыню вымаўляюць слова "мама". Бацькоўства — гэта назаўсёды, бо колькі б не было гадоў сыну ці дачцэ, вы заўсёды будзеце хвалявацца за іх. На жаль, бываюць у нашым грамадстве і прыкрыя выключэнні. Жанчын, якія адмаўляюцца ад сваіх малых, клічуць "зязюлямі", але наўрад ці да іх падыходзіць гэта азначэнне. Зязюля ж падкідвае сваіх птушанят у чужыя гнёзды не таму, што не хоча клапаціцца пра іх, а так вызначана прыродай.

Тут — іх сям'я. Грамадская

Сёння некаторыя з малых пазбаўлены самага галоўнага — бацькоўскай любові і ласкі, бо іх першыя крокі пачынаюцца ў Доме немаўляці. Для абяздоленых дзяцей тут — сям'я, а матуль і татаў ім замяняюць чулыя выхавацелі і ўсе тыя, хто клапоціцца пра іх. У гэтай установе хлопчыкі і дзяўчынкі знаходзяцца да трох гадоў, а потым, калі "не пашанцавала" набыць сям'ю, якую так прагне знайсці душа маленькага чалавека, трапляюць у дзіцячыя дамы.

Ждановіцкі спецыяльны дашкольны дзіцячы дом, як давялося ўбачыць, больш нагадвае ўстанову для адпачынку, падобную да своеасаблівага зялёнага вострава. Яшчэ здалёк прываблівае позірк незлічонае мноства кветак і зеляніны, а ледзь зойдзеш за браму, вочы проста разбягаюцца: клумбы, альпійскія горкі, вадаёмы з лілеямі, скульптуры буслоў, гном-вартаўнік, а далей — агарод, арэлі, дзіцячая пляцоўка...

Куды ні кінеш позірк — усюды ідэальны парадак. Дзеці могуць пагуляць на верандзе ці ў альтанках, з'ехаць з горкі. Вельмі падабаюцца малым скульптуры буслоў, якія выглядаюць так натуральна, што здаецца вось-вось узмахнуць крыламі і паляцяць. Нядаўна ў двары ля стажка сена пасяліўся конь, а хутка з'явіцца для яго і вазок.

Нават наступствы ўрагану гаспадарлівыя рукі супрацоўнікаў прытулку ператварылі ў сапраўдныя шэдэўры: паваленыя дрэвы спілавалі, выразалі ў пнях сярэдзіну, пакрылі лакам ці фарбай. Потым імправізаваныя вазоны запоўнілі зямлёй і пасадзілі кветкі. Пянькі ад тонкіх бярозак зрабіліся ножкамі мухамораў. Крыху фантазіі — і старыя гумавыя мячы, разрэзаныя напалам і расфарбаваныя ў чырвона-белы колер, ператварыліся ў капялюшыкі грыбоў.

З дабрынёй і ласкай

"Галоўная мама", дырэктар дзіцячага дома Тамара Красоўская, займае сваю пасаду ўжо больш як два дзесяткі год і робіць усё магчымае, каб яе падапечным было тут утульна, цёпла і сытна.

Як паведаміла Тамара Васільеўна, на сённяшні дзень у Ждановіцкім дзіцячым доме знаходзіцца каля 100 выхаванцаў, і толькі пяцёра з іх сапраўды страцілі бацькоў, а астатнія трапілі сюды пры жывых матулях, якія альбо па сваёй волі кінулі іх, альбо былі пазбаўлены бацькоўскіх правоў. На жаль, у кожнага тутэйшага дзіцяці маецца нейкае захворванне. Нярэдка гэта ЗПР (затрымка псіхічнага развіцця). А значыць, гэтыя хлопчыкі і дзяўчынкі двойчы пакрыўджаныя лёсам.

Але побач з неверагоднай жорсткасцю родных бацькоў існуе бязмежная чуласць людзей, якія неабыякавыя да вялікага гора маленькіх грамадзян нашай краіны. Так, ужо летась дзевяць выхаванцаў дачакаліся бацькоў, якія назаўсёды забралі іх у сапраўдную сям'ю, тую самую, якая часта снілася малым па начах і знікала раніцай, як толькі яны прачыналіся. Сярод матуль, якія свядома вырашылі ўскласці на сябе дадатковы клопат, ёсць адна зусім, скажам так, незвычайная. Яна жыве каля Ракава і выхоўвае аднаго свайго і чацвёра прыёмных дзяцей. Нізкі паклон гэтай Жанчыне.

Яна добра разумее, што значыць жыць у дзіцячым доме, бо сама рана страціла бацькоў. Але бываюць і адваротныя выпадкі, калі жанчыны пакідаюць немаўлят у радзільні, напісаўшы на аркушы паперы страшныя словы: "Я назаўсёды адмаўляюся ад свайго дзіцяці, як мая маці адмовілася ад мяне." І над гэтай праблемай працуюць псіхолагі ды педагогі і стараюцца, пачынаючы з ранняга ўзросту, закласці дабрыню і ласку ў сэрцы сваіх падапечных.

А яшчэ пра тое, каб малыя адчувалі сябе тут найлепшым чынам, клапоцяцца дзяржава і шматлікія апекуны. Асаблівыя словы падзякі дырэктар дзіцячага дома выказала ў адрас Мінаблвыканкама. Атрымліваюць дапамогу і ад такіх арганізацый, як "Дарыда", "Агракамбінат "Ждановічы", "Белтрансгаз", "Квадрамаркетсервіс" і іншых. Дзякуючы іх клопату, дзіцячы дом мае выдатную матэрыяльную базу: усё новае — ад адзення і цацак да мэблі і аздаблення. Адным словам, у іх ёсць усё, акрамя самага галоўнага — сям'і. Проста выдатна, што за апошнія гады значна ўзрасла колькасць прыёмных бацькоў, але, на жаль, яны знаходзяцца не для ўсіх. Сярод жадаючых узяць дзіця на выхаванне даволі шмат замежных грамадзян, толькі ж перавага ў першую чаргу аддаецца суайчыннікам. Пасля ўсынаўлення пра малога не забываюць, яго наведваюць і падтрымліваюць сувязь з прыёмнымі бацькамі...

Ідзе час, дзеці вырастаюць і прыходзіць пара развітацца з дзіцячым домам, але на гэтым адносіны з выпускнікамі не перарываюцца. За іх лёсам пільна сочаць, запрашаюць у госці на канікулы. Як зазначыла Тамара Васільеўна, развітвацца са сваімі падапечнымі заўсёды вельмі цяжка. Адчуванні падобныя да тых, якія перажывае матуля, калі адпраўляе роднага сына служыць у армію: з аднаго боку — гонар, а з другога — сум. Для выпускнікоў заўсёды наладжваюць сапраўднае свята.

Растапіць лёд у сэрцы

Пагадзіцеся, дзеці — наша будучыня. Ад таго, як мы выхоўваем іх сёння, залежыць наша заўтра. Са звычайнымі хлопчыкамі і дзяўчынкамі, вядома, прасцей, а як пасеяць зерне любові да людзей, Радзімы ў сэрцах дзяцей, якія пазбаўлены бацькоўскай ласкі і цеплыні? Як знайсці патрэбныя словы і адагрэць маленькія сэрцайкі, у якіх столькі болю і адчаю? Менавіта над гэтым працуюць педагогі. І праз мастацкую літаратуру, гульні, экскурсіі выхоўваюць любоў да Радзімы. У даступнай форме дзецям тлумачаць значнасць такіх паняццяў, як мая краіна, наша сталіца, родны пасёлак. З маленства прывучаюць хлопчыкаў і дзяўчынак клапаціцца пра добраўпарадкаванне памятных мясцін, выхаванцы дзіцячага дома не раз бывалі каля Вечнага агню. На сваёй тэрыторыі маленькія гаспадары сярод газоннай травы выклалі словы: "60 гадоў Перамогі." Дзеці вучаць напамяць вершы і песні на роднай мове, у кожнай групе створаны куток з беларускай сімволікай. Праходзяць конкурсы малюнкаў, сустрэчы з салдатамі і афіцэрамі вайсковых часцей, суворавуцамі, ветэранамі. Так, напярэдадні свята Перамогі тутэйшыя насельнікі выступілі з канцэртам для ганаровых гасцей, сярод якіх былі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. А потым мелі магчымасць пагаварыць з імі, прымералі іх фуражкі, распыталі пра медалі. Асаблівасць гэтай сустрэчы ў тым, што дзеці, якія яшчэ не ходзяць у школу, ужо ўсвядомілі, што такое патрыятызм. Такім чынам выхоўваецца павага да сваёй Радзімы, цікавасць да яе мінулага... Зносіны з ветэранамі для дзяцей-сірот — гэта не толькі ўрокі гісторыі, а і магчымасць пашырыць кругагляд, пазнаёміцца з новымі людзьмі. На жаль, хлопчыкі і дзяўчынкі, якія выхоўваюцца ў дзіцячых дамах, не так часта могуць гэта зрабіць.

У звычайных дзіцячых установах падчас свята збіраецца шмат гасцей: бацькі, бабулі, дзядулі, браты і сёстры, а сюды госці прыходзяць усё-такі рэдка. Вось і атрымліваецца, што выступаюць дзеткі самі для сябе. Тамара Васільеўна запрасіла ўсіх, хто жадае, наведваць мерапрыемствы, якія адбываюцца ў іх вельмі часта. Кожны месяц хлопчыкі і дзяўчынкі святкуюць дні нараджэння ўсіх імяніннікаў. Яны і спяваюць ды танцуюць, пачастункі самі рыхтуюць. Для звычайных дзяцей тут няма нічога складанага, а для хворых — гэта сапраўдны подзвіг.

Запрашае кавярня "Буслік"

Пасля гутаркі ў кабінеце дырэктара прапанавала Тамара Васільеўна агледзець будынак дзіцячага дома і бліжэй пазнаёміцца з яго маленькімі жыхарамі.

На дзвярах кожнай групы — прыгожая шыльдачка не з нумарам, а з назвай: "Сунічка", "Званочак", "Матылёк", "Пралеска". Мы завіталі ў адну з іх. Дзеці вельмі ўзрадаваліся. Абступілі нас, задавалі пытанні, шчыра ўсміхаліся і нават рабілі кампліменты. А з якой ахвотай яны згадзіліся сфатаграфавацца! Дзяўчынкі хуценька ўпрыгожылі сябе бранзалетамі ды пярсцёнкамі і паведамілі, што гатовыя. Потым малыя з гонарам паказалі ўсе свае цацкі, куток з сімволікай, дзе ёсць мазаіка ў выглядзе карты нашай рэспублікі, падзеленай на шэсць абласцей. Усе беспамылкова вызначаюць месца для кожнай часткі-вобласці.

У кожнай групе абсталяваны "самотны куток". Часам камусьці хочацца пабыць у адзіноце, сам-насам са сваімі думкамі, вось тады і можна адгарадзіцца ад усяго і ўсіх у імправізаванай хатцы, дзе ёсць і цацкі, і падушка, і коўдрачка — а раптам захочацца легчы і адпачыць ад агульнага тлуму.

У дзіцячым доме знаходзіцца адзін хлопчык, у якога вельмі сур'ёзная хвароба скуры. Пра гэтае дзіця ведаюць і за мяжой. Чулыя апекуны і выхавацелі клапоцяцца аб яго своечасовае лячэнне, якое вымагае немалых сродкаў. Але дарослыя сур'ёзна занепакоеныя тым, што будзе з малым пасля таго, як ён пакіне свой цяперашні дом...

Дарэчы, у гэтай установе педагогі выкарыстоўваюць методыку італьянскага псіхолага Марыі Мантэсоры, якая садзейнічае развіццю мовы, мыслення, уяўлення. Ёсць тут і пакой сацыяльнай адаптацыі, які ўяўляе сабой звычайную кухню з шафамі, электраплітой, мікрахвалёўкай, посудам, сталом і крэсламі. Праз элементы гульні дзеці далучаюцца да рэальнага жыцця.

Каб папярэдзіць прастудныя захворванні, стварылі фітабар. На прысядзібным участку педагогі разам са сваімі выхаванцамі вырошчваюць разнастайныя лекавыя расліны, потым збіраюць іх, сушаць і наладжваюць чаяпіцці.

Утульна адчуваюць сябе хлопчыкі і дзяўчынкі ў кавярні "Буслік", дзе размясціліся тры вялікія сталы з прыгожымі льнянымі абрусамі і сурвэткамі, у кутку — мяккая мэбля, на сценах — мастацкая ляпніна: бусел і героі беларускіх казак. Тут выхаванцы палуднуюць і адзначаюць святы. На дні нараджэння старэйшыя з задавальненнем выпякаюць для малодшых пачастункі, і ўсе разам збіраюцца за святочным сталом. Так выхоўваецца калектывізм.

У хуткім часе адчыніць дзверы музей "Беларуская хатка", дзякуючы якому дзеці будуць больш ведаць пра нацыянальныя традыцыі, звычаі, побыт.

У распараджэнні выхаванцаў вялікая і прыгожая актавая зала, у якой праводзяцца святы і мерапрыемствы, разлічаныя на немалую колькасць гледачоў. У планах — пастаноўка казкі "Бульбачка — шэрая хустачка" і лялечнага спектакля "Жаронцы". Маленькія артысты прагнуць убачыць сярод гледачоў не толькі сваіх "грамадскіх матуль", а і гасцей. Для іх будзе вельмі прыемна і важна пачуць вашы цёплыя словы і апладысменты.

На чарзе — конкурс малюнкаў "Мая Радзіма — Беларусь".

* * *

У холе дзіцячага дома вісіць незвычайны малюнак: выява коціка, які трымае ў лапках званочак. Самое кацяня сімвалізуе дастатак і дабрабыт у сям'і, а званочак заклікае да літасці і дапамогі бліжняму.

Дырэктар Тамара Красоўская зазначыла, што грамадскасць клапоціцца пра дзяцей-сірот. Але трэба ўсвядоміць адно: ніякая дапамога не можа замяніць ім сям'ю. Кожны хлопчык і дзяўчынка хочуць, каб у іх былі тата і мама. Таму і стараюцца тут знайсці для іх сям'ю.

Цяпер дзяржава моцна стала на абарону сацыяльных сірот. Невыпадкова Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду падрыхтаваць нарматыўны акт аб узмацненні адказнасці бацькоў за выхаванне сваіх дзяцей. Так што ў хуткім часе яны за невыкананне сваіх прамых абавязкаў панясуць пакаранне.

А пакуль... У малечы з дзіцячых дамоў, які бачаць незнаёмых жанчын, вочы загараюцца надзеяй: "А можа, гэта мая мама, і яна прыйшла па мяне?"

Малыя мараць, што адчыняцца дзверы, і на парозе з'явіцца доўгачаканыя бацькі. Задумайцеся, можа менавіта вас чакае хтосьці з іх. Вы вельмі парадуеце гэтых хлопчыкаў і дзяўчынак, калі проста завітаеце да іх у госці альбо возьмеце ўдзел у свяце, нават у ролі гледача. Прыходзьце, яны чакаюць.

Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ

Фота аўтара

Штрыхі да творчага партрэта ЛЕАНІДА ДАЙНЕКІ

СУСТРЭЧЫ НА ШЛЯХАХ ГІСТОРЫІ



Вядомы беларускі пісьменнік Леанід Дайнека пачынаў свой шлях у літаратуры як паэт. У 1969 годзе выйшаў яго першы паэтычны зборнік "Галасы". Пасля былі іншыя кнігі паэзіі: "Бераг чакання" (1972), "Начныя тэлеграмы" (1974), "Мая вясна саракавая" (1979), "Вечнае імгненне" (1985). Своеасаблівым падвядзеннем вынікаў папярэдняга паэтычнага шляху стаў зборнік "Сняжынкі пад агнём", куды ўвайшлі выбраныя вершы і паэмы.

Але ўжо напачатку 1970-х Л. Дайнека зрабіў першыя сур'ёзныя крокі ў прозе. У 1976 годзе ўбачыў свет яго першы зборнік апавяданняў "Бацькава крыніца". Пазней з'явіліся раманы "Людзі і маланкі" (1978), "Запомнім сябе маладымі" (1981), "Футбол на заміраваным полі" (1983), "Чалавек з брыльянтавым сэрцам" (1994). Але найбольшы поспех пісьменніку прынёс гістарычны цыкл, у які ўвайшлі раманы "Меч князя Вячкі" (1987), "След ваўкалака" (1988) і "Жалезныя жалуды" (1990). За першы з гэтых твораў у 1987 годзе аўтар атрымаў Літаратурную прэмію імя І. Мележа, а ў 1990-м – Дзяржаўную прэмію БССР за раманы "Меч князя Вячкі" і "След ваўкалака".

У "Слове на дарогу", якое папярэднічае першаму гістарычнаму раману, Л. Дайнека адзначаў: "Даўно мне хацелася напісаць пра беларускую мінуўшчыну. Сверб стаяў у душы, незагойная стрэмка ныла ў сэрцы... Яшчэ ў маленстве <...> чытаючы кніжкі пра славутых віцязяў, пра аблогі гарадоў, пра жахлівыя вастрадзюбыя бярвенні-тараны, якія, нібы шкарлупінне, праломвалі акутыя жалезам брамы, марыў я нейкім чынам сустрэцца з продкамі — крывічамі, дрыгавічамі, радзімічамі". І "сверб" гэты праявіўся ў першым жа паэтычным зборніку. *"Якія яны, мае прадзеды?.."* — пытаецца лірычны герой у вершы "Прадзеды". На працягу амаль усёй творчасці Л. Дайнека імкнецца знайсці адказ на гэтае пытанне.

У першых вершаваных зборніках паказ мінуўшчыны яшчэ не індывідуалізаваны. Аўтар паэтызуе гісторыю Бацькаўшчыны, захапляецца яе мінулым; лірычны герой паэта аддана любіць Радзіму, і любоў гэтая *"замацавана душамі продкаў, што дасюль лунаюць над намі"*.

Напачатку гістарычная тэматыка ў паэзіі Л. Дайнекі гучыць толькі няясным успамінам, ледзь чутным рэхам, як, напрыклад, у вершы "Наваградак" са зборніка "Бераг чакання":

Гэты мох, нібы рэха трывог.
Уздыхае ён сумна і доўга.
Я прыйшоў к табе, замак Міндоўга,
У грымоты суровых дарог.
Ні ўсмешак, ні плачу, ні слоў.
Толькі вецер над сценамі вые.
Сцены гэтыя — лёсы людскія,
Спрасаваныя прэсам вякоў.

Але паступова аўтар звяртаецца да канкрэтных гістарычных падзей і рэальных асоб. Так, у паэме "Песня белага снегу", што ўвайшла ў зборнік "Начныя тэлеграмы", лірычны герой атаясамлівае сябе з Беларуссю, прапускае гісторыю Радзімы праз сябе, сваю душу (*"Шаснаццаты век. І я — ліцвін..."*). Пісьменнік гаворыць аб сваёй далучанасці да мінулага, нават тлумачыць значэнне ўласнага прозвішча. Такі прыём дазваляе аўтару спалучыць лірычны пачатак з рэальнымі гістарычнымі падзеямі, паказаць непарыўнасць сувязі мінулых стагоддзяў з сённяшнім днём. Менавіта таму паэма "Песня белага снегу" поўніцца пачуццём нацыянальнай годнасці, верай у адраджэнне Беларусі:

Але ўдарыў Гаркуша ў звон,
Але Вашчылы шабля блішчыць,
Але Каліноўскага голас чуцён,
І гавару я: — Ты будзеш жыць!

У зборніку "Вечнае імгненне" паэт прысвяціў гістарычнай тэме цэлую нізку вершаў. Іх назвы гавораць самі за сябе: "Постаці гісторыі айчыннай", "Вячка. 1224 год", "Лышчынскі. 1689 год", "Вецер. 1744 год", "Грынявіцкі. 1881 год", "У Полацку над Палатою...". Пасля многія матывы, што гучалі ў гэтых вершах, знойдуць свой працяг у гістарычных раманах пісьменніка.

Менавіта з імем Л. Дайнекі даследчыкі звязваюць узнікненне ў беларускай літаратуры гістарычнага раманнага цыкла. Галоўнымі героямі сваіх твораў пісьменнік абраў рэальных гістарычных асоб: князёў Вячку і Усяслава Чарадзея, караля Міндоўга. Агульная фабула раманаў гістарычна даставерная, бо празаік абапіраўся на летапісныя помнікі, у прыватнасці, на Хроніку Лівоніі, аўтара якой зрабіў персанажам аднаго са сваіх твораў. Аднак раманы не нагадваюць навуковыя трактаты. Творы напоўнены прыгодамі, батальнымі сцэнамі, рамантычнымі гісторыямі, што робіць аповед займальным, цікавым.

Дзеянне рамана "Меч князя Вячкі" разгортваецца на самым пачатку XIII стагоддзя, калі цэласнасці Полацкага княства пагражала крыжацкая навала. І менавіта Вячкаў Кукейнос стаў на яе шляху. Пісьменнік імкнецца зразумець, чаму загінуў Кукейнос. Л. Дайнека паказвае, як разрастаўся уплыў крыжакаў, як падпарадкоўвалі яны сабе ўсё новыя і новыя землі. А Вячка ў гэты час не мог угаварыць полацкіх князёў аб'яднаць свае войскі і разам абараніцца ад ворагаў.

Князь паўстае перад чытачом натурай дзейснай, энергічнай. Ён увесь час то ў сядле, то на перамовах з іншымі князямі, то на полі бою. Вобраз яго ў пэўнай ступені ідэалізаваны. *"Целам — чалавек, душой — анёл"*, — думае пра маладога князя старая рабыня. Ды і сам пісьменнік не аднойчы параўноўвае Вячку з Усяславам Чарадзеем, падкрэсліваючы выключнасць кукейноскага князя, яго значнасць для гісторыі.

Антыподам Вячку паўстае ў рамане полацкі князь Уладзімір, які, у паказе Л. Дайнекі, клапоціцца толькі пра тое, каб застацца сядзець на стальцы. Праўда, такую інтэрпрэтацыю вобраза полацкага князя нельга лічыць гістарычна апраўданай. Многія навукоўцы схіляюцца да думкі, што князь Уладзімір быў актыўным змагаром з крыжакамі, ды і "Хроніка Лівоніі" называе яго галоўным ворагам тэўтонаў.

А вось у паказе імкнення нашых продкаў да незалежнасці ўжо няма ідэалізацыі. Не ўсе князі ў той час разумелі памеры крыжацкай пагрозы. У прыватнасці, князь Даўгерут, не адчуваючы небяспекі з боку епіскапа Альберта, ішоў вайной на эстаў, замест таго, каб аб'яднацца з Кукейносам супраць Рыгі. Поўным супярэчлівасцей паўстае ў рамане і езуіцкі бок. Рыцарскія ордэны варагуюць і нават ваююць паміж сабой. А толькі што заваяваныя плямёны, не зважаючы на хрышчэнне, зноў молятца паганскім багам.

Увогуле, мінулае аўтар паказвае жорсткім і крывавым. Продкі нашы жылі пад пастаяннай пагрозай смерці. Войны і набегі амаль не спыняліся. Маленькі Мірошка застаўся сіратой, бо суседзі-дручане спалілі яго вёску, стрыя прадалі ў рабства, а маці з'елі ваўкі, калі тая выйшла з хаты, каб знайсці ежу.

Не маглі адчуваць сябе ў бяспецы і князі. У рамане "След ваўкалака" Л. Дайнека адлюстраваў самы трагічны перыяд жыцця знакамітага полацкага князя Усяслава Чарадзея. Паланёны братамі, ён сядзеў з сынамі ў порубе і ўжо не спадзяваўся на выратаванне. Аднак кіяне вызвалілі полацкага князя з няволі, каб той абараніў іх ад войскаў хана Шурукана.

Пісьменнік імкнецца не столькі паказаць гістарычны фон, колькі раскрыць асобу Усяслава Чарадзея. Князь паўстае ў рамане мудрым палітыкам, смелым воінам, адукаваным чалавекам. Ён аддана любіць сваю радзіму, таму добраахвотна пакідае Кіеў Ізяславу і вяртаецца ў Полацк.

Сам Усяслаў Чарадзей у рамане паказваецца выключна станоўчым. Ён уважлівы да чужых меркаванняў, хоча, каб язычнікі і хрысціяне жылі ў згодзе. Хрысціянін, але не выракаецца і язычніцтва. І лічыць здраднікам манаха Мяфодзія, які ў маладосці пакланяўся перуну, а пасля хрысціўся: *"Ты плюнуў на ўсё тое, што лічыў святым і вялікім, чаму пакланяўся, чаму вучыў іншых. Яны верылі табе і тваёй веры. Здрадзіўшы Перуну, ты здрадзіў ім ўсім. За цёплую пячору, за сытую старасць, за абяцанне вечнага жыцця ты зрабіўся хрысціянскім манахам"*.

Увогуле, праблема сутыкнення веравызнанняў займае адно з цэнтральных месцаў у гістарычных раманах Л. Дайнекі. Язычніцтва і хрысціянства, праваслаўе і каталіцтва драматычна перакрыжаваліся ў нашай гісторыі, іх стасункі і імкнецца асэнсаваць раманіст. Але калі ў рамане "Меч князя Вячкі" праблема сутыкнення язычніцтва і хрысціянства звязана перш за ўсё з вайной каталіцтва супраць праваслаўя (а ў пачатку XIII стагоддзя гэта азначала вайну паміж рознымі дзяржавамі), то ў рамане "След ваўкалака" паказана барацьба язычнікаў і хрысціян у межах адной краіны. І менавіта хрысціяне паўстаюць у творы не з лепшага боку.

Відавочна, што сімпатыі аўтара на баку язычніцтва. І, раскрываючы характары сваіх герояў, ён паказвае іх сувязь з мінулым менавіта праз памяць пра старажытных багоў. Праваслаўны Вячка захоўвае ў сваёй душы веру продкаў, Усяслаў сумяшчае дзве веры і не можа прыняць нецярпімасць хрысціянства да іншых рэлігій.

А вось кароль Міндоўг у рамане "Жалезныя жалуды" не пакутуе ад пераходу з адной рэлігіі ў другую. Бо застаецца язычнікам: *"Маці мая, мяне нарадзіўшы, скуру мне дала. Глядзі на голую скуру маю. Гэта — першая вера мая, адвечная вера прадзедаў. Потым летняе адзенне я апрануў. Гэта руская вера. Апрану зімовы кажух. Гэта будзе рымская вера. А перад смерцю скіну з сябе ўсе чужыя адзежы і зноў вярнуся голы ў лона агню свайго і веры сваёй,"* — гаворыць ён Войшалку.

Вобраз Міндоўга найбольш глыбокі, шматузроўневы ў параўнанні з персанажамі папярэдніх твораў. Князь паказаны як палітык і чалавек, як сябар і вораг, як бацька і валадар. І ў кожнай з гэтых іпастасяў яго характар раскрываецца па-рознаму.

Чытач упершыню сустракаецца з літоўскім кунігусам, калі той валодае толькі невялікай Варутай. І на працягу рамана мы бачым, як ствараецца будучая дзяржава — Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае — і як змяняецца сам Міндоўг. Пісьменнік паказвае яго ў час паражэнняў, калі кунігас вымушаны хавацца з рэшткамі свайго войска ў балотах, і калі родны сын не пусціў яго ў Наваградак, і Міндоўг праглынуў абразу. Бачым мы караля і ў час перамог, калі ён адваёўвае ў брата сваю Варуту, а пасля становіцца валадаром вялікай дзяржавы.

Але ў якія перыяды жыцця ні паўстае перад намі Міндоўг, у першую чаргу гэта — князь, здольны ахвяраваць сваімі амбіцыямі і бацькоўскай любоўю дзеля дзяржаўных інтарэсаў. Як сапраўдны палітык, *"вострым зрокам воя і дыпламата"* ён бачыў, што *"на захадзе... стаў на жалезныя ногі Тэўтонскі ордэн"*, а *"з далёкага поўдня чуецца дыханне Залатой Арды"*, таму шукаў падтрымкі ў іншых князёў і сярод прыхільнікаў іншых рэлігій. А напрыканцы жыцця ўсё роўна вярнуўся да язычніцтва, да веры продкаў.

Асноўная праблема гістарычных раманаў Л. Дайнекі — патрыятызм. Па-рознаму аўтар вырашае яе ў сваіх творах. Так, князь Вячка адракаецца ад любімай дачкі і сам падпальвае Кукейнос, каб выратаваць княства ад крыжацкіх набегаў. Усяслаў Чарадзей пакідае Кіеўскі сталец Ізяславу і вяртаецца ў родны Полацк. А Міндоўг умацоўвае сваё княства, заваёўваючы ўсё новыя і новыя землі... Звяртаючыся да гістарычнай тэматыкі, Л. Дайнека закранае праблемы адраджэння беларускай дзяржаўнасці, усведамлення беларускай нацыянальнай ідэі, раскрывае вобраз асобы, якая імкнецца знайсці сябе ў служэнні Бацькаўшчыне. Асвятляючы падзеі мінулага, пісьменнік глядзіць у будучыню.

Іна ДАМАРАД

ПРАГМАТЫКІ І ЛЕТУЦЕННІКІ

«Час ляціць як страла, выпушчаная на самым пачатку стварэння свету», — словы Віктара Шніпа, укладальніка доўгачаканага «Дня паэзіі—2005». Сапраўды імгненна праляцела адзінаццаць гадоў з часу выхаду апошняга альманаха («Дзень паэзіі — 1993/1994»), як і незаўважна надышоў сёлетні своеасаблівы 40-гадовы юбілей гэтага выдання — першы зборнік пабачыў свет у 1965 годзе.

Пра канцэпцыю стварэння «Дня паэзіі—2005» можна сказаць цытатай з верша Генадзя Пашкова: «Ты — прагматык, // я — летуценнік». Творы больш за 100 аўтараў дэманструюць жанрава-стылёвую і тэматычную разнастайнасць сучаснай паэзіі. Тут па-жаночы пяшчотная лірыка Святланы Явар, Тацяны Сівец, ваенная, па-мужчынску суровая гамадзянская паэзія Міколы Аўрамчыка і Пятра Прыходзькі, філасофскі роздум Юркі Голуба, элегічны настрой Казіміра Камейшы, светлы ўспамін і горыч жыццёвай праўды ў вершах Ніны Загорскай. Перад чытачамі праходзяць шляхетны Леанід Дранько-Майсюк, экстравагантны Зміцер Вішнёў, сур'ёзны Уладзімір Сцяпан, экзальтаваная Валерыя Кустава, не па ўзросце змрочная Віка Трэнас, мудры Ганад Чарказян і многія іншыя.

Здавалася б, у паэзіі, якая ўзнікла таксама амаль "на самым пачатку стварэння свету", сучасныя аўтары наўрад ці змогуць пра адвечнае, нязменнае і даўно адкрытае сказаць пановаму. Але ж, на шчасце, і сённяшні дзень не бедны на паэтычныя знаходкі. Да прыкладу, арыгінальна-іранічна глядзіць на сэнс быцця Наталля Капа і ўжо нязвыкла доўгая назва яе твора гаворыць пра многае: "Элегічны верш, які пачынаецца канстатацыяй дробных непрыемнасцяў побытавага характару, а скончваецца невялікім экскурсам у глабальныя праблемы чалавецтва". Пасвойму цікавы верш-музычная актава Віктара Гардзея "Ноты":

Ластаўкі на дроце — быццам ноты.
ДОбра бачна: вылет малады.
РЭквіем жыццю пасля спякоты
МІласэрна стогнуць правады.
ФАрбы смутку развядуць слязамі.
СОЛЬ зямлі адгрузяць за даўгі.
ЛЯ крыніц, напоеных дажджамі,
СІтны хлеб смачней за пірагі...

Безумоўна, паэтычныя набыткі сучаснікаў не раўназначныя. У некаторых з іх перапляваюцца старыя, як свет матывы: «Душы маёй так дрэнна і балюча, // Ці паміраць, не ведаю, ці жыць», — банальна «пакутуе» Валянціна Габрусёва, а пасля задае пытанне, якое няблага было б звярнуць да аўтаркі — «І што ж яна, жанчына, хоча?» Побач — спецыяльна не прыдумаеш — Ірына Войтка з радкамі «Чаго, чаго хачу, // Куды кірую шлях?». Абедзве паэткі не менш «арыгінальна» самі і адказваюць: першая — «Жанчына хоча толькі тое, // Што хоча літасцівы Бог», другая — «Іду шукаць, як вы, // Жыцця свайго асноў»...

Тым не менш, зборнік, што змяшчае вершы беларускіх паэтаў розных пакаленняў, цікавыя матэрыялы пра паэтаў і паэзію, а таксама пародыі і эпіграмы, кажучы словамі Святланы Багданкевіч, — «У вечнасць пералітае імгненне», спыненае і зафіксаванае, дзякуючы якому сённяшні паэтычны дзень не згубіцца ў часе.

P.S. Выдавецтва "Мастацкая літаратура" плануе і ў наступным годзе выдаць "Дзень паэзіі—2006", матэрыялы для якога прымаюцца да 1 сакавіка 2006 г.

Наталля ЯКАВЕНКА

«ПРАМОВА МЯЛЕШКІ» — шэдэўр беларускага барока

Выдатным узорам беларускай патрыятычнай літаратуры сярэдзіны XVII ст. з'яўляецца "Прамова Мялешкі", напісаная невядомым аўтарам, які належаў да шляхецкага асяродку, што вынікае з тэксту твора. Пісьменнік выразна сфармуляваў ідэю непарушнасці беларускіх сямейных і побытавых традыцый, адзначыў іх высокую каштоўнасць для ўсіх часоў і ўсіх пакаленняў.

У "Прамове Мялешкі", бадай, упершыню ў беларускім пісьменстве прагучала думка пра небяспеку канчатковай і незваротнай страты беларускім народам сістэмы ўласных нацыянальных каштоўнасцяў — маральных, эстэтычных, грамадскіх, дзяржаўных, палітычных. У творы сцвярджаецца жыццёвая неабходнасць вяртання грамадства да старасветчыны, калі, на думку аўтара, паўсюль на нашых землях панавала шчырасць, адкрытасць, разважлівасць, не было месца пустой балбатні і палітыканству, падману і дэмагогіі. Праз ухваленне мінуўшчыны, нават ідэалізаванне яе пісьменнік-патрыёт даказваў, што праўда, сумленнасць, ахвярнасць дзеля Бацькаўшчыны — вышэйшыя каштоўнасці, вечны і нязменны ідэал. Аўтар меў рацыю, калі пісаў пра "залаты час Літвы", перыяд княжання Жыгімонта Старога (1506 — 1548), бо, сапраўды, у гэты перыяд імкліва развівалася беларускае рэнесансавае мастацтва. Акурат у гэты час Ф. Скарына засноўвае кнігадрукаванне. Тады ж быў закладзены падмурак ці не першай у Еўропе прававой краіны, што замацоўвалася Статутам 1529 г. У першай палове XVI ст. Вялікае княства Літоўскае знаходзілася на ўздыме: узводзіліся новыя замкі і бажніцы, квітнела культура, мацаваўся дух нашых продкаў. У многім гэта адбылося, як справядліва гаворыцца ў "Прамове Мялешкі", дзякуючы дбайнасці манарха, які даходзіў да ўсяго сам, клапаціўся пра ўвядзенне ў дзяржаве справядлівых законаў, усяляк заахвочваў абаронцаў Айчыны.

На старонках твора аўтар уздымае балючую тэму саслаблення старой беларускай дзяржавы. Заняпад краіны пачаўся з часоў Жыгімонта Аўгуста (1548 — 1572), які, паводле слоў пісьменніка, забыўся на інтарэсы княства, падпаў пад ляшскі ўплыў, злачынна перадаў Польшчы Валынь з Падляшшам, урэшце, сам пачаў лічыць сябе "ляхам". Але галоўная прычына крызісу Вялікага княства Літоўскага, на думку аўтара "Прамовы Мялешкі", — здрада магнатаў, вышэйшых урадоўцаў, якія следам за манархам пачалі выракацца сваіх традыцый, жыць на чужы лад. Міжусобнымі звадкамі яны загубілі дзяржаву, давялі да поўнай галечы просты люд. Уласныя амбіцыі і непамерная пыха засляпілі ім вочы.

Аўтар публіцыстычнай "Прамовы Мялешкі" закрануў тэму ролі і адказнасці шляхецкага саслоўя за становішча ў гаспадарстве. Ён папракае, дакарае шляхту за згодніцтва, якая бачыла заняпад, але баялася "баламутных радных паноў", маўчала, нібы варам абвараная, замест таго, каб рашуча супрацьдзейнічаць адшчапенцам і пярэваратням. Народ-шляхта як найвышэйшы носьбіт улады ў княстве павінны быў, паводле аўтара, узнавіць колішнія парадкі і праз сваіх абраннікаў усталяваць справядлівасць, пакараць злачынцаў.

У "Прамове Мялешкі" рэзка асуджалася паланізацыя нашага краю, агрэсіўныя намеры палякаў здабыць землі на Смаленшчыне ды Інфлянтах.

Аўтар раскрытыкаваў норавы наезджых іншаземцаў — "ляхаў" і "немчыкаў". Першыя, паводле ягоных слоў, увільвалі як маглі ад працы, кралі, што трапляла пад рукі, усё паганілі й псавалі, але пры гэтым не забываліся смачна есці й шыкоўна апранацца. Ляхаў аўтар "Прамовы..." называе нахабнікамі, бессаромнымі і непамерна ганарлівымі. Нязвыклая нямецкая ахайнасць і акуратнасць выклікаюць усмешку літвіна. У "Прамове Мялешкі" высмейваецца малпаванне чужых нораваў, мудрагелістасць вопраткі, ненатуральнасць, манернасць паводзінаў, перанятых у іншаземцаў. Адмова ад традыцыйнай маралі, народнай этыкі і эстэтыкі, паводле высновы аўтара, сталася адной з прычын грамадскага заняпаду, шляхецкай разбэшчанасці і распуснасці.

"Прамова Мялешкі" ў старажытныя часы ніколі не друкавалася. Яна пашыралася выключна ў рукапісных варыянтах. Адзін з найстаражытнейшых спісаў твора доўгі час захоўваўся ў бібліятэцы графаў Храптовічаў у Шчорсах. Першапублікацыю "Прамовы Мялешкі" ў 1819 г. здзейсніў І.У.Нямцэвіч у зборніку «Zbiyr pamiktnikyw histarycznych o dawnej Polsce». Да найлепшых узнаўленняў "Прамовы Мялешкі" належыць публікацыя, здзейсненая З. Даўгялам у кнізе "З беларускага пісьменства XVII стал." (Мінск, 1927).

Пераклад выкананы паводле публ.: Даўгяла З.І. З беларускага пісьменства XVII стал. Мінск, 1927. С.34 — 39.

Іван САВЕРЧАНКА,
доктар філалагічных навук

«ПРАМОВА МЯЛЕШКІ»

Найяснейшы міласцівы кароль, і ласкавыя да мяне, панове-браты!

Выехаўшы з дому, Богу памаліўся, каб да вас здаровым прыехаў ды вашых міласцяў здаровымі пабачыў. Прыйшлося мне з вамі радзіцца, а я ж на такіх з'ездах ніколі не бываў, з каралём, яго міласцю, ніколі не засядаў.

Толькі за часамі князёў нашых, каторыя каралявалі і каторыя ваяводамі бывалі, сентэнцый тых не было: адкрытым сэрцам шчыра гаварылі, палітыканства не зналі і ў рот праўдаю, як соллю ў вочы, кідалі!

Скора ж каралі больш немцаў, чымся нас улюбілі. Намі грэбаваць пачалі. І што старыя нашы князі сабралі — тое ўсё немцам раздалі нашыя гаспадары!

А Жыгімонта караля дык няма чаго і за чалавека лічыць, бо Падляшша і Валынь нашыя вытруціў. За ляха сябе лічыў!

Адзін толькі Жыгімонт першы — салодкая памяць яго! Той немцаў як сабак не любіў! А літву і русь нашу ласкава мілаваў! І значна лепей пры ім нашым жылося, хоць і не хадзілі ў дарагіх світах. Пры ім чужакі без нагавіц, як бернардыны, гулялі, сарочкі аж да костак і шапкі аж да самага пояса насілі. Дай, Божа, ізноў такой гадзіны дачакацца!

А цяпер, нат я сам калі па-хатняму апранаюся, то яе міласць, пані Мсціслаўская, жонка мая, нацешыцца і наглядзецца на мяне не можа. Надта ўжо аглядаемся на ўсё тое чужое, міласцівыя панове, на тыя нудныя нямецкія штукі, што сталі ў модзе.

А калі ж то ў іх бывала. У сукнях стракатых ходзяць і грошай бяз ліку маюць! А колькі гарадоў і местаў трымаюць — то не хы-хі! Вельмі схільныя чыніць ліхое, маніпулююць каралём панам, рэч паспалітую (дзяржаву), як ужо колісць было, баламуцяць!

І калі сам нямчына ідзе, або жонка яго ступае — дык скураная вопратка скрыпіць, шалясціць, дарагім піжмом ваніць! Калі ж да цябе панічок прыедзе — частуй яго дастаткам! Ды яшчэ і жонку сваю каля яго пасадзі. А ён сядзіць, як бес надзьмуўшыся, шапкаю ківае і з жонкаю перашэптваецца, ды ў далоньку скрабе. А калі б гэткага чорта кулаком у морду, па твары, ды па хрыбце! Так, каб кароль яго міласць не чуў, — няхай бы морды такой паганай не надзьмуваў!

Помню я караля Генрыха, каторы з заморскага нямецкага боку быў. Той зразумеў, што мы яму няшмат дазволім сваволіць. Дык ён, даведаўшыся, што тут не мёд, сам, нікому не сказаўшы, прэч паехаў у сваю краіну. Аж за мора згінуў!

Кажучы праўду, не так вінаваты кароль, як тыя радныя баламуты, што пры ім сядзяць ды круцяць. Многа тутака такіх ёсць, што хоць наша костка, аднак сабачым мясам абрасла і ваніць! Тыя радныя, з іх баламутнямі — нас дзяруць, губяць! З-за іх нашыя пакарыстацца нічым не могуць! Краіну губяць! Валынь з Падляшшам адцяпалі ў нас!

Ведаю, прыйшлося нам так, што ходзім, як падвараныя. Але таму, што іх баімся, праўды не кажам, а яшчэ й падхлебнымі языкамі падтакваем! А калі б гэткага беса кулаком у морду! Забыўся б другі муціці!

І тое, міласцівыя панове, немалая шкода, што ад слугаў-ляхаў маем! Давай яму сукню хвалендышавую і кармі яго сытна. А службы з іх і не пытай! Толькі шыкоўна апранецца і на высокіх падкоўках да дзевак дыбае. І ходзіць, з высокага куфля пацмоктвае. Ты, пане, за стол — і слугалях сабе за стол! Ты — боршчык, а слуга-лях, на куце — кавалак мяса. Ты за фляшку, а ён за другую. А калі слаба трымаеш, дык ён і з рук вырве! Толькі пільнуе, як ты з дому — ён маўчком прылашчыцца да жонкі. Выгнаць гэткага чартапалоха, разам з немцамі, што да нас улезлі насуперак праву нашаму!

Ад іх міласцяў, паноў-ляхаў, гінуць нашыя старыя паклоны Смаленскія! Лепш прадзярыце вочы на Інфлянты! Бо тыя мечнікі як улезуць туды, дык іх і зублем не выкурыш, як пчол ад мёду!

Нагода пагаварыць і пра іншыя нашыя страты. І тое не малая справа — хаваць коняў дрыгантаў на стайні! Улетку і ўзімку давай ім авёс і сена, падсцілай ім нанач. Утрымлівай дзеля ўходу за імі слугу-ляха, канюшага і машталера, ды не пытай з іх аніякае іншае службы! А калі яшчэ той лях, як жарабец, іржэ каля дзевак, нібы дрыгант каля кабыл, — дык пастаў да яго двух літвіноў на стражу, бо й сам дзідка не ўпілнуе!

І тое на свеце дурацце — гадзіннікі! Мне патрафілася на кірмашы ў Кіеве купіць. Даў за яго тры капейкі грошаў, а як паслаў да Вільні на паправу — дык ажно на пяць коп накруціў заморскі злодзей! Добры наш гадзіннік — певень, бо няхібна апоўначы кукарэкае.

І тое вельмі страшная шкода — галагузых курэй разводзіць, іх ўжываць. Нявартa і іншых птушак смажыць, а таксама торты ўсякія цынамонам, міндалямі цукраваць! За маёй памяццю прысмакаў тых не бывала. Добрая была гуска з грыбкамі, качка з перчыкам, пячонка з цыбулькаю ці часначком. А калі на раскошны дастатак — каша грэчневая з шафраном. Віна вугорскага не ўжывалі. Перадусім, малмазыю толькі півалі, мядок і гарэлачку дзюбалі! Затое грошаў дастаткова мелі, муры моцныя будавалі ды вайну слаўную мацней і лепей трымалі, чымся цяпер.

І тое зусім недарэчна, што пані ў багатых сукнях ходзяць! Не зналі раней партугаляў ці фартугаляў! І падалок рухаецца, і каля падалка чапляецца! А дваранін у ножку, як сокал, углядаецца, каб дзе ўшчыпнуць салодкага мяса! Я б раіў, каб нашыя белажонкі ўбіраліся ў даўнія казакінкі, шнураванныя ззаду. Насілі распоркі, а да іх ужывалі нямецкія плюндрыкі. Не так бы хутка аматары скрадывалі спакусу. А цяпер, хоць з рагацінаю стой, — такога беса ў жывыя вочы не ўпільнуеш!

Далей аб чым радзіці — не ведаю. Вашай міласці тое нагадваю, каб колькі сенатараў і паноў літоўскіх пры каралю, яго міласці, заўжды былі. І я каб быў. Толькі каралеўшчыны не маю, бо перад другімі не схапіў!

І што гаварылі тут — усё праўда.

І Уршулю, каралеўну яго міласці, у ручку пацалаваў, як і іншыя малодшыя сенатарчыкі. Не дзівіціся, міласцівыя панове-брацця! Спрадвеку гаворыцца: сівізна ў бараду — а чорт у рабро за поясам.

Дзеля добрага ведання стаўку купіў.

Не толькі ў Смаленску, але і ў Мазыры ўвесь павет пра тое радзіўся, каго б мудрага на той з'езд дзеля прамовы выправіць. Мяне, чалавека вядомага, да вашай міласці паслалі.

І як Бог даў, змог адкрыць перад каралём яго міласцю і вамі, пановебрацця, нашыя парады.

Хтосьці з вас няхай скажа лепей, толькі без баламутні, а я на тым спыняюся!

Пераклаў Іван САВЕРЧАНКА

Віктар ШНІП

* * *

...І гром загрымеў,
быццам трэснула неба,
І дождж несусветны праліўся, як срэбра,
На нашу з табою, як вечнасць,
зямлю.
Я дождж несусветны, як мора, люблю
І ў ім патанаю сцюдзёным душою,
Як вецер у садзе знікае вясною,
Калі сад квітнее, нібыта ўскіпае,
Нібы белы сцяг над сабою ўздымае,
Каб здацца дарэшты ідучаму лету...
Кідаю ў ваду, як свой сум, цыгарэту,
Бо гром загрымеў,
быццам трэснула неба,
І дождж несусветны праліўся, як срэбра,
Якое ў аблоках анёлы хавалі
І замкі з аблокаў сабе будавалі.
Ды гром загрымеў, нібы рухнулі вежы,
І дождж, нібы шкло,
пазасыпаў нам сцежкі,
Каб нам не вярнуцца
ніколі ў той свет,
Дзе ты мне сказала халоднае:
"Нет..."

* * *

Жыццё — не верш, яго не перарыфмаваць.
І ты жывеш,
нібыта мой забыты верш,
Які да смерці мне цяпер успамінаць.
І ўжо, як верш,
сваё жыццё ты не парвеш,
Бо новы дзень, як снег,
як чысты ліст паперы,
Дзе ўжо ў цябе, як і ў мяне,
замкнуты дзверы,
Нібыта дзверы могуць сёння зберагчы
Нас ад жыцця, якое навакол, як мора,
Дзе вые вецер, як сабака, у начы,
Дзе ўсё было даўно, але, нібыта ўчора,
Быў новы дзень, як снег,
як чысты ліст паперы,
І для мяне ў цябе былі адкрыты дзверы,
Як неба нам заўжды адкрытае
над намі.
Жыццё—не верш,
яго ўжо не перапісаць.
І мы жывём, нібы трава,
што пад крыжамі,
Дзе нам травой, нібыта вершам,
стаць...

* * *

Ізноўку снег, як белая арда,
Наш горад захапіў у цемнаце,
І ў ціхай рэчцы белая вада
Ільдом ля белага маста цвіце,
Дзе чорны воран, як стары манах,
Хаваецца спалохана ў кустах.
А можа й не хаваецца, а сам
Шукае ля вады ўчарашні дзень,
Дзе куст шыпшыны быў,
нібыта Храм,
Чырвоны, а цяпер, як смерці цень,
Стаіць пад снега першага ардой,
Што хутка стане бруднаю вадой
І ў рэчку сыдзе, нібы ў небыццё,
І воран узляціць па-над ракой
Самотны, як пражытае жыццё,
І вольны, нібы мы цяпер з табой
Прад снегам, што, як белая арда,
Наш горад захапіў у цемнаце,
Дзе час праз нас, як праз пясок вада,
Працёк, застыўшы лёдам на вадзе...

* * *

Зноў не хапае часу,
як вады ў пустыні,
І зоркі, як пясок,
над намі сонна стынуць
І мы ідзём не помнячы ідзём куды
Да мары светлай,
як да прывіднай вады,
Якой спатоліцца ніколі мы не зможам,
Але сваё прад смерцю ў часе падарожжа
Згадаць паспеем,
нібы азірнуцца сумна
На шлях, дзе як заўсёды ветрана
і тлумна,
Дзе часу не хапае,
як вады ў пустыні,
Дзе ў полі лён, нібыта неба, сіні-сіні,
Дзе хата родная, нібыта карабель,
Што сеў пад цяжарам былых гадоў
на мель.
І мы ідзём не помнячы ідзём куды
Праз час, нібыта праз пустыню
да вады,
Якой няма, але якая ў марах ёсць,
Нібыта ў памяці былая маладосць...

* * *

...А ён вершы любіў вечарамі чытаць,
Як у прыску вуглі залатыя шукаць,
Каб ізноўку агонь распаліць уначы
І да раніцы потым агонь берагчы,
Быццам вершы ўсю ноч
пра каханне чытаць.
І праходзіла ноч, бы мінаў цэлы век,
І званілі званы за вакном на царкве,
Бы вярталіся ў неба анёлы з зямлі,
Што ў санетах, бы ў клетках,
самотна жылі
Покуль іх уначы не знайшоў чалавек...

* * *

Агонь гучыць і ў цемнаце знікае,
Нібыта ружы чорным снегам замятае
Зіма, дзе нам з табой ніколі ўжо не быць.

І я іду і ў цемнаце, як крык, знікаю
І, як дарогу да святла, цябе шукаю
І не знаходжу, не ўцякаю ад журбы.

Агонь гучыць, але ніхто яго не чуе,
Ён ува мне мяне ад цішыні ратуе,
Нібы ў сухмень ратуе
ціхі дождж траву.

І я вяртаюся туды, дзе ў снезе ружы,
Дзе позірк твой халодны,
нібы сёння сцюжа,
Дзе я адзін, як след твой на зямлі,
жыву...

* * *

Ты заўсёды самотны, як неба, як зоры,
Ты заўсёды самотны, як наша зямля,
Дзе густыя лясы, векавыя прасторы,
Дзе заўсёды самотны,
як крык жураўля,
Крыж стары ля дарогі, якая ў чужыну,
Быццам бы на клады,
не знікае ў траве,
Над якою стаіць, як былое, каліна,
Над якою туман, як наступнасць,
плыве,
І таму ты самотны, як неба,
як зоры,
Да якіх мы ляцім, як праз сон,
праз гады
І губляемся ў вечным бясконцым
прасторы,
Бы ў пяску адзінокія кроплі вады...

* * *

Мы ўсе адыдзем у нябыт, і пыл
Спакойна зацярушыць, замяце
Сцяжыны і дарогі да магіл,
Дзе наша тло травою прарасце,
І будзе цёмнай ноч і светлым дзень,
І хтось народзіцца і хтось памрэ,
І ля адкрытых у царкву дзвярэй
Нябёсы адлюструюцца ў вадзе,
Бо пройдзе дождж, бы ўспомніцца патоп,
Дзе, як Каўчэг,
старэнькая царква
Пераплыве Еўропу, як акоп,
І следам зашуміць палын-трава...

Сяргей МАЛЯЎСКІ

ВАЛОЖЫНСКІ ВАЛЬС

Вольна ў далеч аблокі плывуць
над Валожынам,
З яблыняў цвет, нібы снег,
вецярок закружыў.
Вулачкі ціхія свечкі каштана
ўпрыгожылі —
Нашай Айчыны часцінку,
якой даражым.

Узгоркі, нізінкі, рачулкі
палоска імклівая...
Дзе яшчэ знойдзеце больш
краявідаў такіх?
Як завяшчанне нам — веліч граніту
шчымлівая —
Помніце тых, каго з вамі няма,
землякі!
Хоць да шырокіх, сталічных
праспектаў далёка нам,
Але хай ведае кожны жаданы
наш госць —
Мы ганарымся заўжды
нашым слаўным Валожынам,
Ёсць у Валожыне людзі цудоўныя,
ёсць!

У ВЁСЦЫ

Яшчэ спяваюць пеўні на зары,
Але патроху зарастаюць сцежкі,
Паркан да долу хіліцца стары.
А пах духмяна-кіслы
з хлебнай дзежкі
Амаль нідзе не ўчуеш на двары.
Яшчэ шапоча сад зялёналісты,
Ды не відаць між яблынь дзетвары,
А куст парэчак чырвана-агністы
Неабабранай ягадай гарыць.
Уздоўж вулкі хаткі нібыта прыселі
Ад цяжкай працы перавесці дух.
І пахаванняў болей чым вяселляў,
Падворкаў меней, дзе жывуць удвух.
Пад ветрам дуб стары
раскінуў рукі,
Са стогнам лёг грудзьмі
на правады...
Увосень больш не будуць
нашы ўнукі
Пад ім збіраць рудыя жалуды.
Над студняй журавель яшчэ трымае
У доўгай дзюбе ржавае вядро,
І галава яго пахілая, нямая
Самоціцца над зорак серабром...



Малюнак Ул. ЛУКШЫ

ВЫДАННІ

Сярэднееўрапейскі часопіс ***"Кафка"*** фінансуецца Інстытутам Гётэ, выходзіць на пяці мовах — нямецкай, польскай, вугорскай, чэшскай, славенскай. У апошнім з нумароў, выдадзеным у Берліне, адпаведна на нямецкай мове, надрукаваны вершы Зміцера Вішнёва, Вальжыны Морт і артыкул Кацярыны Нарбутовіч пра сучасную беларускую літаратуру.

На старонках тэматычнага каталога ***"Пісьменнікі Беларусі — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны ў зборы Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры"*** чытач знойдзе новыя звесткі пра падзеі ў гады вайны, пра жыццё і творчасць беларускіх літаратараў.

Зборнік вершаў і песень ***"Феерверк" Яўгена Карпуця*** складаецца з дзвюх частак — "Імгненні жыцця" і "Спявайце, мае землякі". Разам з тым, гэта выданне з'яўляецца даволі ўдалай спробай аб'яднаць творы рознай тэматыкі, што стварае сапраўдны феерверк эмоцый, пачуццяў і ўражанняў.

У кнізе ***Івана Сачука "Цяплом душэўным падзялюся..."***, якая з'яўляецца, паводле вызначэння аўтара, "дакументальнай аповесцю пра сябе, пра час і — педагогіку", знітаваліся эпізоды трагедыі і радасці, дзяцінства і дарослацці. Тут дасціпна і цікава паказваецца, што такое сапраўдная жыццёвая мудрасць і педагагічны талент, распавядаецца пра хлапчуковую дапытлівасць і мару стаць настаўнікам, пра каханне, пошукі свайго шляху ў жыцці ды многае іншае.

ПАЛІТО

Навела

Уладзімір СЦЯПАН

Старая аднапавярховая аптэка месціцца насупраць Палаца культуры. Калі праходжу побач з ёй, абавязкова падыму галаву — гляну на цёмныя вокны гуртка выяўленчага мастацтва, які наведваў гады чатыры запар. Хадзіў туды ледзь не штодня, заседжваўся да ночы, аж пакуль не праганялі... Гурток, які працаваў гадоў дваццаць, і з'яўляўся гонарам Гэ Пэ, перастаў існаваць разам з кіраўніком. Не стала настаўніка — не стала і гуртка. Памяшканне з вялікімі вокнамі і паркетнай падлогай ёсць. Сцены стаяць. І начынне засталося, мальберты, стэлажы, гіпсавыя скульптуры, самавары, прасы, васковыя муляжы садавіны і гародніны. Кавалкі рознай тканіны. Шкілет чалавека, зразумела, штучны, і белыя чарапы: каня, каровы, авечкі, сабакі — самыя сапраўдныя...

Колькі ні спрабавалі гурток аднавіць — не атрымалася.

Я стаяў у чарзе па таблеткі, разглядаў аптэчнае шкло — бутэлечкі рознапамерныя, і думаў пра маленькія малюнкі выдатнага мастака Мітрохіна. Заўсёды менавіта ў аптэках згадваю яго простую і выразную графіку, а таксама гравюры і малюнкі чорнай тушшу японскіх мастакоў...

Мужчына за спінаю кашлянуў, але не так, як кашляюць ад хваробы, а так, каб звярнулі ўвагу. Высокі мужчына ў шэрым зімовым паліто, камечыць у руках чорную кудлатую шапку і на мяне глядзіць. Твар доўгі, паголены кепска, пад падбароддзем шчэць шэрая, а рот фіялетавы, як атрамантам перапэцканы, рэдкія шэрыя валасы да ілба папрыклейваліся. Незнаёмы твар, зусім незнаёмы. Паціскаю плячыма і працягваю на паліцы дзівіцца, спрабую засяродзіцца, каб ізноў пра японскіх паэтаў і бутэлечкі аптэчныя думаць.

— Што, не пазнаў... — Гучыць у вуха. — Захварэў?

Міргаю, углядаюся ў незнаёмы твар.

— А я цябе адразу пазнаў, як толькі ў аптэку зайшоў. Глянуў і пазнаў.

— Бывае. — Прамовіў слова і не ведаю, што далей сказаць.

— Я — Даніленка Міхась. Мы з табой разам у студыю хадзілі, маляваць вучыліся. Да Сільвестравіча... — Кажа ён абсалютна без усялякіх сантыментаў у голасе.

Дзіўна. Але так бывае. У Гэ Пэ людзей не шмат, а трыццаць гадоў не бачыліся. Паціскаем рукі, але зморшчыны на Мішкавым твары не разгладжваюцца. Не знікаюць. Яго доўгі твар не маладзее, а наадварот камянее, шэрыя вочы цямнеюць.

Звычайна, знаёмыя дзяцінства: аднакласнікі, аднагодкі, — просяць грошы і прапануюць разам выпіць. Калі грошы ёсць — даю, без надзеі, што яны вернуцца. Але пазыкі бывае што часта вяртаюцца. Сябры, з якімі басцяўся па пыльных вулках і цёмных калідорах старой аднапавярховай школкі, прыносяць грошы маме і дзякуюць. Пры наступнай сустрэчы, праз год — два, нагадваюць, што пазыку вярнулі і зноў просяць... Але Даніленка грошы пазычаць не збіраўся.

— Ты таксама змяніўся. Сівы нейкі. А я вось лысы амаль зусім.

— Гады — гады. — Кажу банальны жарт, каб не маўчаць, каб запоўніць пустату.

— Кажаш, гады. — Паўтарае мой сумны жарт Даніленка. Націск падае на першы склад кароткага слова.

З аптэкі выходзім разам. Стаім перад Палацам культуры, пад цёмнымі вокнамі гуртка. Маўчу, бо скурай адчуваю што ён зараз скажа нешта такое пра што доўга, нястомна і напружана думаў.

— А ты ніколі не згадваў той вечар, калі мы з табой вось тут пабіліся? Што, не чакаў такога пытання, маўчыш. Значыць, не думаў. Як гэта так, ты, слабейшы і меншы за мяне, змог тады перамагчы?

— Змог жа неяк... А як, і сам не ведаю.—Кажу не без лёгкага, амаль незаўважнага гонару.—І вось што цікава — не дапамог ні хто, сам.

— Значыцца, думаў. — На Мішкавым твары на імгненне з'яўляецца радасць.

Кручу пачак цыгарэт, спрабую ўздзець пальчаткі. На вуліцы сцюдзёна, ветрана, а мой знаёмы шапку камечыць. Вочы ад ветру блішчаць.

Не такое яно і салодзенькае, не такое цукровае — дзяцінства ў Гэ Пэ, якім падаецца праз гады... Не ўсё там празрыста і бесклапотна...

Памятаю засяроджаныя і злосныя твары гурткоўцаў. Восеньскі вечар. Халоднае святло ліхтара. Калі яшчэ толькі сыходзілі па шырокіх лесвіцах з Палаца культуры — я напэўна ведаў, што пачнецца на вуліцы. Бойкі не баяўся. Рэдка бывае, калі не страшна біцца. Тады страшна не было зусім. Мы з сябрам і пяць падлеткаў супраць нас. Мішка сказаў што будзе біцца толькі са мной, а астатнія каб не лезлі, стаялі і не заміналі... Ён разлічваў, што я спалохаюся і ўцяку. Не атрымалася — не кінуўся я ў ратавальную цемру. Біліся пад ліхтаром. Качаліся па асфальце і клумбе, ірвалі адзежу, кусаліся... Я маўчаў, а ён крычаў, як рэзаны, быццам з яго жыўцом скуру здзіралі...

Я падняўся на ногі, а ён застаўся ляжаць акрываўленым тварам у асфальт. Я ганарыўся сабой і мой сябар мяне падбадзёрваў. Дома мяне , ванітавала, як прытручанага. Бацькі толькі на раніцу агледзелі які іх сын. Мама абмацала галаву і грудзі. Да мяне прагучала кароткае "пасодзяць", а да бацькі злоснае "а ты што маўчыш?"

Мішку завялі тым жа вечарам у бальніцу. Наклалі колькі швоў, прамылі раны, перавязалі, а на раніцу знялі пабоі і склалі заяву ў міліцыю.

З гуртка мяне выгналі на наступны дзень. Вінаватым я сябе не лічыў, бо сам на бойку не напрошваўся і першым не лез.

— Я табе паддаўся. — Ціха і сумна кажа ён і ўглядаецца мне ў вочы. — Паддаўся.

Адварочваюся, спрабую запаліць, вецер задзімае агеньчык.

— Як жа я цябе ненавідзеў... Каб ты толькі ведаў... Каб ты не з'ехаў — я б цябе забіў.

— За што, Міша? За тую дурную бойку? Кінь... Калі яно было?

— Пры чым тут бойка. Ты мне жыццё зламаў, праз калена. І нават не задумаўся...

— .....

— Гэта я павінен быў мастаком стаць, у сталіцы вучыцца. Я ў царкву хаджу...

На такія словы застаецца адно, хітаць згодна. Што і раблю.

— А ты, відаць, і не памятаеш калі там быў?

— Бывае заходжу.

— Я не п'ю і не палю — вера забараняе. — Слова "вера" прагучала, як імя жанчыны.

— ...

— Я радаваўся, як на крылах лётаў, калі Сільвестравіч цябе з гуртка выгнаў і вітацца нават з табой перастаў. Думаў, што ўсё табе, не падняцца, і перамога за мной. Мне трэба было, каб ты мяне тады збіў, змясіў як след. Вось тут пад вокнамі. Я крычаў, каб Сільвестравіч пачуў, у акно пабачыў... Дарма атрымліваецца... Усё жыццё міма.

Немалады мужчына ў доўгім паліто і з кудлатай шапкай у руцэ ішоў па вуліцы, сыходзіў, а я стаяў пад аптэкай і глядзеў, як жанчыны ў белых халатах парадкуюць лекі ў асветленай зале.

Мішка Даніленка — стараста гуртка. Выдае паперу, алоўкі, тушыць святло, замыкае пасля заняткаў студыю і здае пад роспіс у гардэроб вялікі самаробны ключ, які пахне латунню і пакідае на пальцах цёмныя сляды. Калі я прыйшоў у студыю, Мішка займаўся два гады і вельмі добра маляваў. А я маляваў кепска ў параўнанні з астатнімі. Усё атрымлівалася нейкім кволым, крывенькім, нязграбным. А галоўнае, абсалютна нежывым. Фарбы на маіх краявідах і нацюрмортах былі блёклыя, брудныя, цьмяныя і невясёлыя... Стараўся, хацеў, са скуры быў гатовы вылузнуцца, але не атрымлівалася. Праўда, настаўнік зрэдку казаў што-небудзь суцяшальнае, падбадзёрваў — не за малюнкі, а за стараннасць. Але мая стараннасць і працоўны фанатызм былі нішто ў параўнанні з Мішкавымі высілкамі і прагай дасканаласці. Ён мог сядзець не разгінацца, крэмзаць, крэмзаць... Мог не адыходзіць ад мальберта паўдня, і як толькі вытрымліваў...

Мяне Мішка не залюбіў адразу. Не спадабаўся я яму, ну зусім не прыйшоўся. Не ведаю, за што і чаму... Адно, што прыходзіла ў галаву, дык тое, што Сільвестравіч быў маім суседам, і часам мы разам прыходзілі ў студыю, а бывала, што і сыходзілі. Але я тут ні прычым — так склалася, што ён жыў з нашай суседкай.

Як так атрымалася і пра што я думаў, калі маляваў Мішкава старое восеньскае паліто, на старамодным выкручастым вешаку, не ведаю і растлумачыць не магу. Здаецца, ні пра што такое асаблівае не думаў. Глядзеў то на паліто шэрае, зношанае, абтрапанае, то на паперу — і крэмзаў, штрыхаваў... Паліто на малюнку, нечакана для мяне самога, атрымалася пазнавальным і жывым. І хлясцік з адарваным гузікам, і пакамечаны каўнер, і адтапыраныя кішэні — усё склалася адно да аднаго. Яно — паліто, рыхтык гаспадар, партрэт Мішкі Даніленкі, яго фотаздымак. А гумку, каб нешта падцерці, паправіць, я ні разу ў руку не ўзяў, не часта такое бывае...

Заставалася зусім мала, каб скончыць. Але Мішка палез па кішэнях свайго паліто і ўсё імгненна змянілася. І рукавы не так вісяць, і каўнер не туды глядзіць... Зноў так паліто не павесіш — кожны разумее. Яно ж не зэдлік, не кубак з адколатай ручкай...

Я нешта сказаў, не стрымаўся. Нават не мог згадаць потым, што менавіта, якія словы вырваліся, зляцелі з языка. Відаць, крыўдлівыя, але не надта, бо ён тады не адказаў.

Настаўнік спыніўся толькі перад маім малюнкам.

— Твой. — Ён ласкава зірнуў на старасту гуртка.

— Гэта мой... — Сказаў я ціха і адляпіўся ад сцяны.

Настаўнік не пачуў, ён прысеў на кукішкі перад планшэтам.

— Акакій Акакіевіч Башмачкін... Не новы шынель, а той — стары... Зношаны, які вецер наскрозь прадзімае... Аж мароз па скуры прабягае... Вось так і трэба маляваць, маладыя вы зусім.

— Гэта мой малюнак. — Прашаптаў я і пачырванеў, каб потым збялець.

На твары настаўніка застыла непадробнае здзіўленне і сполах. Ён не знайшоў нічога лепшага, як пагладзіць мяне па галаве.

Таго малюнка праз два дні не стане. На яго выпадкова выплеснецца густая алейная фарба. Ярказялёная, як першая трава. І вінаватых не будзе...

Потым, праз гады, у мастацкай вучэльні і мастацкім інстытуце, будуць знікаць лепшыя малюнкі, будуць запісвацца паверху партрэты і нацюрморты, пэцкацца і рвацца палотны і аркушы, у выдавецтве будуць губляцца ілюстрацыі да кніжак...

Гэта будзе працяг прыгодаў "шыняля". Таго самага, праз зношаную тканіну якога праглядае невыводная чалавечая зайздрасць.

Арт-пацеркі

Трэці Міжнародны тэатральны фестываль "Залаты віцязь" прайшоў, як вядома, у Мінску. Тэатры з пяці краін прадставілі на суд журы каля 40 работ у розных намінацыях. Спектакль "Чычыкаў" нашага Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы адзначаны "Сярэбраным віцязем". У іншым жанры вылучыўся Беларускі дзяржаўны музычны тэатр: яго мюзікл для дзяцей і дарослых "Бураціна. BY" ганараваны статуэткай "Залатога віцязя".

Архітэктар Сталін Федчанка ды скульптар Генадзь Буралкін вылучаныя ад Беларусі на атрыманне прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2006 год. Дзяржаўны камітэт пагранвойскаў, Беларускі саюз архітэктараў ды Гродзенскі аблвыканкам рэкамендуюць адзначыць новую працу гэтых вядомых творчых асоб. А менавіта — мемарыяльны ансамбль воінам-пагранічнікам, адкрыты летась у Гродне. Гэта манументальны помнік, прысвечаны трагічнай падзеі пачатку Вялікай Айчыннай вайны, калі за тры дні загінулі 19 тысяч абаронцаў тады яшчэ агульнай савецкай дзяржаўнай мяжы — 14 пагранатрадаў, якія імкнуліся стрымаць наступленне агрэсара. Праца над мемарыялам працягвалася 3 гады. Ён уяўляе сабою плошчу, роўную стадыёну, дзе ўстаноўлены гранітны помнік (450 тон каменю было дастаўлена з Карэліі): на разарванай лініі мяжы паўсталі пагранічнікі, закрываючы сабой Айчыну. Помнік палеглым, але нескароным воінам Беларускай пагранічнай акругі стаўся ў Гродне новым месцам правядзення ўрачыстых цырымоній і рытуалаў, звязаных з ушанаваннем воінскай славы і незабыўных падзей мінулага.

З 6 па 17 снежня ў сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва пройдзе выстаўка сучасных беларускіх мастакоў, прысвечаная памяці адметнай асобы рускага "срэбнага веку" В. Барысава-Мусатава (першая частка гэтага праекта ладзілася раней у Музеі гісторыі беларускага кіно). Чаму Барысаў-Мусатаў? Куратар выстаўкі і творчага аб'яднання "Арцель" Р. Несцераў зазначае: "На нашых вачах, пад гром барабанаў і лозунгі, адмаршыравала XX стагоддзе, век партый і дэмагогіі, век выдатных тэхнічных дасягненняў і век жорсткасці ды нецярпімасці... У сённяшняй цішыні мы можам вылучыць нягучны голас Барысава-Мусатава, "найчысцейшага і найтанчэйшага паэта душэўнага жыцця", чалавека, які пагарджаў хітрасцю і ненавідзеў ману. Ён не гнаўся за модай, ён ішоў супраць плыні. Пражыўшы кароткае 35-гадовае жыццё, ён памёр у XX стагоддзі, але душой застаўся ў XIX. Цяпер, у XXI стагоддзі, разам з ім да нас прыходзіць "свет мастацтва", мара, высокі ідэал, самаахвярнасць і высакароднасць..." 8 снежня за "круглым сталом" будуць абмяркоўвацца праблемы сучаснага мастацтва.

С. ВЕТКА

"Залаты шлягер-2005 у Магілёве" толькі-толькі пачынаўся, а ў святочнай атмасферы ўжо луналі дзелавыя прапановы: зрабіць фестываль, як раней, штогадовым і больш працяглым, вярнуць у яго праграму конкурс маладых выканаўцаў...

Залатое рэтра

Прыхільнікі песеннага свята, на якім царуе эстрадны рэтра-шлягер, спадзяюцца, што ў хуткім часе фестываль умацуе свой бюджэт, а гэта значыць, з'явіцца мажлівасць пашырыць яго абсягі, сцвердзіць паўнавартасны міжнародны статус, прымаць большую колькасць гасцей, вызначыцца саліднымі ды прэстыжнымі конкурснымі ўзнагародамі. Бо тое, што рэнесанс папулярнага фэсту пачаўся, адчулі відавочцы ўжо сёлетняга, дзевятага па ліку, "Залатога шлягера", у поўную афіцыйную назву якога дадалося і месца сталай прапіскі — яно ж, як вядома, і месца нараджэння. Яго новыя арганізатары ашчадліва і мудра скарысталі сціплыя (параўнальна з колішнімі выдаткамі, праз якія вакол "Залатога шлягера" пару гадоў таму склалася прыкрая, каб не сказаць крымінальная, сітуацыя) цяперашнія фінансы — і атрымалася прыгожае ды не крыклівае, шчырае свята для горада, для гасцей Магілёва.

А самымі вядомымі гасцямі былі, бадай, расійскія спевакі Валянціна Талкунова, Людміла Сенчына, Уладзімір Трошын, Сяргей Захараў, Алег Анофрыеў, Аляксандр Малінін, іх украінскі калега Мікалай Гнацюк ды яшчэ ВІА — куміры старэйшага пакалення: "Добры молодцы", "Синяя птица"... Імпрэзы ладзіліся ў некалькіх залах і ўтваралі своеадметную жанравую поліфанію: настальгічныя ноткі традыцыйнай "Рамансіяды" пад акампанемент аркестра народных інструментаў Магілёўскай абласной філармоніі з маэстра Леанідам Івановым; гарачыя лацінаамерыканскія рытмы — класічная эстрадная экзотыка! — у іскрыстым шоу групы "Salsa boys"; "Далёкія ды блізкія 80-ыя" з цяперашнімі "Песнярамі"; новыя галасы маладзёжных ансамбляў — удзельнікаў конкурсу на прыз імя Уладзіміра Мулявіна ..

Захаванню добрых традыцый і абнаўленню "Залатога шлягера" паспрыяў чынны ўдзел у яго праграмах заслужанага калектыву Беларусі, Нацыянальнага канцэртнага аркестра на чале з Міхалам Фінбергам — дарэчы, новым мастацкім кіраўніком гэтага фестывалю. Дзякуючы яго творчай патрабавальнасці, прынцыповаму непрыманню фанаграм на эстрадзе, галоўныя фестывальныя канцэрты ладзіліся сёлета без аніякіх "плюсаў" ды "мінусаў", толькі ў жывым гучанні, у жывых і свежых, арыгінальных аранжыроўках. Кульмінацыяй жа сталася аўтарская вечарына ганаровай госці з Масквы — Аляксандры Пахмутавай, чыё імя ўспрымаецца як сімвал цэлай эпохі ў развіцці савецкай (ды і сённяшняй расійскай) масавай песні. У той канцэртнай праграме пад крыху тужлівай назвай, сугучнай вядомаму прышеву, — "Как молоды мы были..." — удзельнічалі салісты нашага аркестра і спевакі-госці, а таксама паэт Мікалай Дабранраваў, спадарожнік Аляксандры Пахмутавай і ў творчым, і ў звычайным штодзённым жыцці. Сама ж кампазітар на нейкі час адчула сябе часцінкай вялікага аркестравага калектыву, амаль на ўвесь вечар заняўшы месца за раялем...

І няхай паміж вось гэтым шматкроп'ем ды заключнай кропкай у сённяшніх нататках пра свята незабытых песень прагучыць спадзеў на годны працяг яго жыццяпісу. Тым болей, што наступны "Залаты шлягер у Магілёве" мусіць быць асабліва ўрачысты, юбілейны. Ужо дзесяты. Для фестывалю гэта, можна сказаць, — узрост пасталення.

С.Б.

Фота А. Мацюша

***НА ЗДЫМКАХ:** Марына Мулявіна, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага цэнтра музычнага мастацтва, які носіць імя яе легендарнага бацькі, уручае Гран-пры пераможцу конкурсу ВІА — мінскаму ансамблю "Псальмяры"(кіраўнік і саліст Дзмітрый Пятроўскі); аўтарскі вечар Аляксандры Пахмутавай; бразільскае прывітанне.*

Першыя ў Еўропе

Тое, што аказалася не па сілах дарослым беларусам, змаглі ажыццявіць дзеці. На III Міжнародным дзіцячым конкурсе песні "Еўрабачанне-2005", які прайшоў 26 лістапада ў бельгійскім горадзе Хасселт і ў якім бралі ўдзел 16 краін, перамагла наша зямлячка — дзесяцігадовая Ксенія Сітнік. Разам з Палінай Ждановіч і Васілём Раінчыкам (малодшым) яна выканала песню "Мы разам".

Звонкі дзіцячы голас, непасрэднасць і адметная манера выканання настолькі зачаравалі еўрапейскую публіку, што Беларусь з самага пачатку абвяшчэння вынікаў галасавання патрапіла ў спіс лідэраў.

Падчас прэс-канферэнцыі Ксенія паведаміла, што дасягнуць такога поспеху ёй перш-наперш дапамагла мама, якая была настаўніцай па вакалу. Юная спявачка падзякавала ўсім, хто падтрымаў яе, і закончыла словамі з песні: "Мы можам многага дасягнуць, калі будзем разам. Дык давайце памножым і смех, і ўсмешкі, і песні".

Перамога Ксеніі Сітнік на III Міжнародным дзіцячым конкурсе песні "Еўрабачанне-2005" — гэта яскравы прыклад працы дзяржавы з таленавітай моладдзю. Такое меркаванне выказаў у інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Алег Праляскоўскі. Ён адзначыў, што бліскучая перамога дзесяцігадовай беларускі на "Еўрабачанні" ў чарговы раз пераконвае, што таленты трэба выхоўваць на сваёй зямлі, іх неабходна знаходзіць, берагчы і дапамагаць ім развівацца.

Ян МНІШАК

Фота забяспечана аўтарам

ЗОРНЫ ЧАС БЕЛАРУСКІХ ЦЫМБАЛАЎ

Чытачы "ЛіМа" ўжо ведаюць пра тое, што ў расійскім горадзе Пскове прайшоў III Міжнародны фестываль-конкурс выканаўцаў на шматструнных народных інструментах. 5 дзён музычнага форуму праляцелі непрыкметна, але пакінулі яскравы след у сэрцах жыхароў Пскова і гасцей.

За гэты час адбыліся тры канцэрты ў Вялікай зале абласной філармоніі, дабрачынныя выступленні ў раёнах, конкурснае праслухоўванне выканаўцаў. А яшчэ — навукова-практычная канферэнцыя, дзе прагучалі даклады пра народныя традыцыі ў музычным мастацтве. Магчымасць пачуць адно аднаго, спазнаць разнастайнасць і непаўторнасць роднасных інструментаў мелі выканаўцы з Расіі, Літвы, Латвіі, Беларусі, Японіі — усяго каля 300 удзельнікаў. Нашу краіну прадстаўлялі студэнты і выкладчыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, БДУ культуры і мастацтваў, Мінскага дзяржаўнага музычнага вучылішча імя М. Глінкі; у конкурснай праграме ўдзельнічалі таксама прадстаўнікі Віцебшчыны, Магілёўшчыны і Брэстчыны.

Загадчык кафедры народных інструментаў і акардэона Літоўскай музычнай акадэміі прафесар Ліна Найкялёне, якая працавала ў журы конкурсу, выказала свае ўражанні пра гэтае музычнае свята: "Пскоў — гэта горад, у якім беражліва ставяцца да гістарычнага мінулага. Менавіта таму пскавічы заснавалі такі цудоўны фестываль нацыянальных культур. Там, дзе памятаюць пра свае вытокі, шануюць і культурныя традыцыі іншых народаў. Як член журы, адзначу высокі прафесійны ўзровень выканаўцаў".

Адным з самых яскравых момантаў фестывалю стаўся канцэрт "Multi Voce", што азначала шматталоссе, шматколернасць нацыянальных музычных культур. Тут адбыўся сапраўдны парад зорак народнай творчасці розных краін: ансамбль рускай музыкі "Пскоў", ансамбль цымбалістаў "Залатая струна" Мінскага музычнага вучылішча імя М. Глінкі ды інш. Гучалі разнастайныя шматструнныя народныя інструменты: гуслі, кантэле, цымбалы, канклес, кокле. Выканаўцы паказалі магчымасці сваіх інструментаў, на якіх выконвалася як народная, так і сучасная музыка.

Фестываль-конкурс адкрыў новых таленавітых выканаўцаў. Гран-пры і званне лаўрэата атрымала студэнтка БДАМ Віялета Моўчан (клас прафесара Тацціяны Сергяенкі). Дарэчы сказаць, што на гэтым конкурсе самая шматлікая была дэлегацыя з Беларусі, і кожнага яе прадстаўніка журы адзначыла граматай ці дыпломам. Беларуская цымбальная школа яшчэ раз даказала, што яна — адна з самых лепшых на міжнароднай музычнай арэне. І нашы цымбалісты былі сапраўднымі зоркамі яскравага міжнароднага музычнага свята, якое ладзілася ў Пскове.

Дар'я КАРАНЧУК

Фота забяспечана аўтарам

ЛЁН І МОДА

Упершыню ў нашай краіне прайшоў фестываль "Лён-2005". Беларускі цэнтр моды наладзіў яго 10 лістапада. А наступным днём быў праведзены паказ калекцыі "Вясна — лета 2006". Мэта мерапрыемстваў — азнаёміць людзей з творчасцю беларускіх мастакоў-мадэльераў, выявіць у гэтай прафесіі здольную моладзь і ўзняць прэстыж вырабаў з лёну. Але чаму менавіта з гэтага матэрыялу?

— Лён нясе ў сабе станоўчую энергетыку. Псіхолагі і лекары ўпэўненыя, што льняное адзенне здымае з чалавека пэўную колькасць нервовасці, адмоўных эмоцый. Таксама гэта незвычайны прадукт для мадэльераў, бо такую тканіну можна выкарыстоўваць і ў авангардных, і ў класічных мужчынскіх і жаночых мадэлях. Вядома, лён можна спалучаць з бавоўнай, шоўкам, сінтэтыкай. І яшчэ адзін станоўчы момант — невысокі кошт гэтай сыравіны, — расказала дырэктар Беларускага цэнтра моды Любоў Манулік.

На фестываль прывезлі свае вырабы каля 20 айчынных прадпрыемстваў. Сярод іх — вядомыя ААТ "Світанак", ЗАТ "Вяснянка", гомельская фабрыка "8 Сакавіка", ЗАТ "Калінка". Прыемны факт: мадэльеры адышлі ад "подыумнай моды" і стварылі калекцыі штодзённага адзення і абутку.

Лён здаўна выкарыстоўваўся для вырабу вопраткі. Напэўна, "адраджаючы" яго, мэтазгодна было б успомніць не толькі сам матэрыял, але і арнаменты (або іншыя традыцыйныя аздобы), якія ўжываліся ў часы актуальнасці льну? Любоў Манулік патлумачыла:

— У межах нашага фестывалю было паказана 25 калекцый, у тым ліку і фальклорныя напрамкі, з элементамі гістарычнага. Але гэта не тое, што апраналі нашы бабулі, а модныя мадэлі адзення з элементамі фальклору — як жаночыя, так і мужчынскія.

А на паказе "Вясна — лета 2006", які мне давялося ўбачыць, былі прадстаўлены тры калекцыі: "Underworld" Эльвіры Жвікавай, "Milky, Milky Way" Марыі Ніцэвіч і "Sexy Safari" Вольгі Ламакі, якая, дарэчы, выстаўляла шмат калекцый на Захадзе.

Адкуль узяліся назвы? "Underworld" — гэта нешта такое... па-за светам", — смеючыся, паспрабавала растлумачыць мадэльер Эльвіра Жвікава, яна ж галоўны мастак цэнтра моды. Яе мадэлі адзення былі вытрыманыя ў цёмных танах. У другой калекцыі пераважаў светлы, "лёгкі" колер. Калі я глядзеў на яе, дык... Вы, напэўна, ведаеце на смак цукерку "Milky Way"? Паказанае (амаль аднайменнае!) адзенне можна параўнаць з ёю. Адчуванні падобныя. І менавіта Марыя Ніцэвіч была ўзнагароджана дыпломам за самую стыльную калекцыю. А "Sexy Safari", мажліва, навеяна яе аўтару афрыканскімі матывамі (мадэлі нават дэфіліравалі пад стук тамтамаў). Часцяком вырабы нагадвалі цыганскія строі і былі адкрытыя настолькі, каб падкрэсліць жаночую прывабнасць.

Адзначу, што ва ўсіх трох калекцыях быў прадстаўлены і абутак з лёну — своеасаблівае "вынаходства" беларуска-італьянскага прадпрыемства "Le Grand".

Адным словам, было на што глядзець. Дарэчы, мадэльеры не хаваюць сваю аўтарскую прадукцыю:

— Зразумела, мы не праводзім мерапрыемстваў "дзеля галачкі", і літаральна праз некалькі тыдняў можна будзе набыць каля паловы нашых вырабаў. Але гэта не будуць тысячныя патокі экземпляраў: эксклюзіўныя рэчы Беларускі цэнтр моды пакуль што выпускае невялікімі партыямі, — паведаміла дырэктар цэнтра і абнадзеіла: — **Але кошт будзе даступны, бо лён наш, беларускі.**

Алесь КІРЫКОВІЧ

Фота аўтара

ПЕРАКЛАДЫ

Павал ЯНІК (Славакія)

Павал Янік (1956 г.н.) — вядомы славацкі паэт, драматург, афарыст, публіцыст, грамадскі дзеяч, старшыня Саюза пісьменнікаў Славакіі, дэлегат устаноўчага збору Міжнароднага форуму "Паслы славянства" (Мінск, 2000). Аўтар паэтычных зборнікаў "Няпэўныя весткі" (1981), "Люстра ў канцы лета" (1984), "Да пабачэння ў множным ліку" (1985), "Ура, гарыць!" (1991), "Нехта як Бог" (1998), "Няхай будзе пах твой " (2002) і інш.

ХРЫЗАНТЭМАТЫКА

У пішучай машынцы
і ў друкарскай фарбе
паміраюць вершы,
у якіх пульсавала
неўтаймоўная і пыхлівая
блакітная кроў
шляхетнага чарніла.

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ ДУШ

Нам ужо вяртаюць
нашы ўласныя,
нацыяналізаваныя
і прыватызаваныя душы.
Кожнаму — ягоную.

Мы іх не пазнаем,
хоць мелі яны дастаткова
азнак.

Яны ўжо раздадзены.
Цяпер мы вечна будзем
вучыцца
З імі жыць.

Уздыхнуць жа яны тады,
Калі мы іх нарэшце выдыхнем.

СУМНЫ НОВЫ ГОД У КАНЦЫ СТАГОДДЗЯ

Прыяцелі і непрыяцелі
пары дзіцячай
адыходзяць з нашага
жыцця

Хто гуляе нашымі лёсамі
ракавую шахматную
партыю?

На бела-белай дошцы
чорна-чорныя фігуркі
раптам чырванеюць
ад крыві
з апошніх навін

Мы падаем пад стол
дастаткова цвярозыя
і канчаткова мёртвыя

Пераклад Івана ЧАРОТЫ

Пераважная большасць з нас (МЫ ў дадзеным выпадку — гэта сучаснікі-суайчыннікі як збіральны "вобраз-персанаж") выпрацавалі адну з самых каштоўных для выжывання ў вірлівым *сёння* здольнасцей — здольнасць не заўважаць складанай сітуацыі там, дзе яна не проста ёсць, але пагражае незваротнымі наступствамі. Напрыклад, любы, хто мае дачыненне да бягучага літаратурнага працэсу, амаль фізічна адчувае, як паскараецца яго герметызацыя: сустрэча жывога пісьменніка з рэальным чытачом пачынае ўсведамляцца як сапраўдная ўдача, бо для першага "шырокая чытацкая аўдыторыя" паўстае прывідам, а для другога існаванне "сучаснага беларускага літаратара" падаецца амаль містыфікацыяй.

Калі ніхто не сумняваецца ў тым, што Чалавека (асобу, грамадзяніна, патрыёта і г.д.) трэба выхоўваць, дык ці варта браць пад сумненне такую ж відавочную неабходнасць выхоўваць Чытача (праніклівага, чулага, эстэтычна падрыхтаванага і да т.п.), што здолеў бы адэкватна ўсведамляць заканамернасці і варункі сённяшняй мастацкай славеснасці?

Пытанне гэтае, насуперак цвярозаму розуму і культурнай логіцы, далёка не рытарычнае (заўважым, — не толькі для беларускай літаратурнай прасторы). Складанасць праблемы, бадай, абвострана адчуваюць тыя пісьменнікі, што маюць стасункі (у тым ліку — прафесійна-педагагічныя) са школьнай і студэнцкай аўдыторыяй, прадстаўнікі якой (анекдатычны, але далёка не адзінкавы выпадак!) найчасцей не могуць назваць ніводнага прозвішча сучасных трыццаці-, сарака-, пяцідзесяцігадовых літаратараў... Атрымліваецца, што ва ўяўленні нашых патэнцыяльных чытачоў НЯМА не аднаго схільнага да парадаксалізму творцы, а цэлых літаратурных пакаленняў!..

"ЛіМ" наважыўся замест адзінкавых рэплік у СМІ, спарадычных выступленняў спецыялістаў на нарадах ды канферэнцыях па праблемах суадносін сучаснай мастацкай літаратуры і сучаснай жа адукацыі (розных ступеняў) прапанаваць сваім чытачам панарамнае бачанне сітуацыі; якраз з гэтай мэтай было прапанавана выкладчыкам, настаўнікам, пісьменнікам, студэнтам, выдаўцам і проста людзям неабыякавым адказаць на наступныя пытанні:

1. Наколькі з вашага пункту гледжання змест падручнікаў па беларускай літаратуры адлюстроўвае сучасны літаратурны працэс?

2. Не падаецца вам, што школьнікаў, асабліва падлеткаў, лепш пачынаць знаёміць з нацыянальнай літаратурай праз творы займальна-прыгодніцкага жанру, каб спачатку зацікавіць, а пасля навучыць?

3. Ці павінен падручнік выглядаць як мастацкі твор?

4. Як павінен быць арганізаваны вучэбны (крытычны) матэрыял падручніка і якой мовай напісаны?

Менавіта вашае меркаванне можа стацца самым важкім.

РЭДАКЦЫЯ

Вера ЛЯШУК,
прафесар, член-карэспандэнт БелАА

1. Перш чым адказаць на пытанне пра месца сучаснага мастацкага слова ў школьным курсе літаратуры, неабходна акрэсліць само паняцце. Калі сучаснай літаратурай лічыць творы, напісаныя ў 80—90 гг. XX — пачатку XXI стагоддзяў, можна адназначна сказаць, што ім адведзена сціплае месца, прычым большасць значыцца ў спісах для пазакласнага чытання.

Які твор уключаць у школьную праграму, вызначае структура літаратурнай адукацыі. Тая, што існуе сёння, для вывучэння бягучага літаратурнага працэсу мажлівасці не дае. Гэта найперш датычыць VII (IX) – XI (XII) класаў.

Для мяне паняцце "сучасная літаратура ў школе" вымяраецца не часам напісання твора, а актуальнасцю для чытачоў пачатку XXI стагоддзя. Калі з гэтай пазіцыі паглядзець на творы, якія значацца ў школьнай праграме, то ім належыць прыярытэтнае месца. Яскравы прыклад — верш Ф. Скарыны "Понеже от прірожденія звери..." напісаны ў XVI ст. — ён надзвычай актуальны і цяпер: усё жывое любіць месца свайго нараджэння, яго трэба шанаваць і чалавеку. Знаёмства з гэтым творам мэтазгодна ў VII ці ў крайнім выпадку VIII класе. Аповесць "У палескай глушы" створана Якубам Коласам на пачатку мінулага стагоддзя, а хто скажа, што юнакі абыякавыя да праблемы сэнсу жыцця, пошукаў свайго месца ў ім, кахання, узнятых у гэтым творы і сёння?

2. Даследаванне, праведзенае выкладчыкамі кафедры методыкі вывучэння беларускай літаратуры і краязнаўства Брэсцкага універсітэта, засведчыла, што вучні V — IX класаў аддаюць перавагу фантастыцы і прыгодам. На жаль, гэтыя жанры недастаткова прадстаўлены ў школьных праграмах, дзе яны павінны быць уключаны абавязкова і пажадана ў кожны клас базавай школы. Дарэчы, аўтары праграм і падручнікаў з Брэста імкнуліся да гэтага (зрабілі праграмнымі, напрыклад, "Эрпіды на планеце Зямля" Місько, IV клас, "Палескія рабінзоны" Маўра, VII клас, "Брама неўміручасці" Крапівы, VII клас, "Дзікае паляванне караля Стаха" Караткевіча, IX клас).

Што датычыць таго, каб з падобных твораў пачынаць вывучэнне нацыянальнай літаратуры (напэўна, маецца на ўвазе V клас), ідэя, на маю думку, сумніўная па некалькіх прычынах.

Па-першае. Ці знойдзецца дастатковая колькасць высокамастацкіх (падкрэсліваю, менавіта высокамастацкіх) твораў у беларускай літаратуры, адрасаваных пяцікласнікам? Наколькі я дасведчана ў дзіцячай літаратуры, то не. Па-другое, развіццё вучняў, як даказалі псіхолагі, адбываецца пры ўмове, калі яны пераадольваюць складанае, якое становіцца даступным, што і забяспечвае іх развіццё. Ці не здарыцца так, што, вывучаючы фантастыку і прыгоды як творы лёгкія для ўспрымання, мы тым самым не будзем спрыяць павышэнню культуры чытання вучняў, пачнём адлучаць ад класікі, ад духоўных набыткаў народа ў сферы прыгожага пісьменства?

3. Па літаратуры ў школе выкарыстоўваюцца падручнікі двух тыпаў: хрэстаматыйны і гісторыка-літаратурны. Першы з'яўляецца адзіным у базавай школе. Раней у IX класе адзінаццацігадовай школы іх было два. Пераважнае месца ў хрэстаматыі належыць мастацкім творам. Мусіць, аўтары падручнікаў гэтага тыпу бачаць задачу ў тым, каб той матэрыял, які складае метадычны апарат, не кантраставаў з творамі па эмацыйнасці, багацці і дакладнасці слова.

Што датычыць падручніка гісторыка-літаратурнага тыпу, які б вызначаўся адзінствам зместу і формы і нагадваў ці нават выступаў як мастацкі твор, — гэта было б цудоўна. Мне, на жаль, з такім падручнікам сустрэцца не давялося ні ў Беларусі, ні ў Расіі, ні ў Польшчы, ні ў Венгрыі. Думаю, што падручнік — мастацкі твор — ідэал, прываблівае перспектыву, якую, можа і здолее рэалізаваць нехта надзвычай таленавіты. У школе вывучаюцца розныя пісьменнікі, творы розных жанраў і стыляў, крытычныя артыкулы, звесткі па тэорыі літаратуры... Цяжка зрабіць падручнік цэльным, які б чытаўся як твор прыгожага пісьменства. А раптам нехта і зможа?! Час пакажа.

4. Адносна методыкі вывучэння літаратуры неабходна зыходзіць з таго, што педагогіка не церпіць аднастайнасці. Настаўнік павінен валодаць усім арсеналам спосабаў, сродкаў, форм правядзення ўрока, памайстэрску вар'іраваць імі, каб кожны новы ўрок не быў паўтарэннем папярэдняга. Важна таксама выразна ўсведамляць зыходныя пазіцыі — чаго мы чакаем ад урокаў літаратуры. Калі мы жадаем далучыць вучняў да здабыткаў беларусаў у прыгожым пісьменстве — адна справа. Зусім іншая, калі мы зарыентаваны на тое, каб вучням не трэба было прыкладаць ніякіх асабістых намаганняў. Для мяне апошняя пазіцыя непрымальная. Я лічу, што народ меў рацыю, калі прыйшоў да высновы: "Без тлумачэння — няма вучэння", якая высока цанілася грамадствам. Цяпер жа неадкладная задача — дабіцца павелічэння колькасці гадзін па беларускай літаратуры і неабходна прывесці ў адпаведнасць аб'ём навучальнага матэрыялу з колькасцю гадзін, адведзеных на яго вывучэнне ў межах года, тэмы, асобнага твора. Пастаўленая задача патрабуе прытрымлівацца навуковых падыходаў. Іншага выйсця няма.

Надзея НАВАЖЫЛАВА,
вучаніца 11 класа гімназіі № 214 г. Мінска

1. Калі пад словамі "сучасны літаратурны працэс" разумець найперш развіццё літаратуры другой паловы XX стагоддзя, можна сказаць, што падручнікі адлюстроўваюць гэты перыяд аб'ектыўна і крытычна. Калі маецца на ўвазе літаратура апошніх дзесяцігоддзяў, то лічу сучасны стан роднай літаратуры чымсьці амаль загадкавым. І гэта не толькі маё меркаванне. У мінулым навучальным годзе я правяла анкетаванне сярод дзесяцікласнікаў гімназій і школ з рознымі мовамі навучання (рускай і беларускай), каб даведацца, як успрымаюць беларускую мову і літаратуру сённяшнія падлеткі. На пытанне: "Ці ведаеш ты што-небудзь пра стан, напрамкі, тэндэнцыі сучаснай беларускай літаратуры? Калі так, то што?" — большасць (85 працэнтаў) дала адмоўныя адказы.

2. Звярнуся да прыкладаў з таго ж анкетавання: у адказ на пытанне "Якія творы са школьнай праграмы па беларускай літаратуры запомніліся табе як найбольш цікавыя?" — часцей за ўсё ўзгадваліся "Непаўторная вясна" ("Трывожнае шчасце"), "Аблава", "Жураўліны крык" і творы Янкі Купалы. Пры адказе на пытанне "Якія творы ты "далучыў" бы пры магчымасці да школьнай праграмы па беларускай літаратуры?" — узгадваліся непраграмныя творы Дударава, Быкава, Шамякіна, Караткевіча, Макаёнка, сучаснікаў, выказваліся пажаданні бачыць больш твораў на тэмы кахання, сяброўства, прыгодніцкай і філасофскай літаратуры. Пытанні ж, што датычылі адмоўных уражанняў і прапановы выключыць штосьці з праграмы, часцей за ўсё мелі адказам такія назвы, як "Слова аб палку Ігаравым", "Песня пра зубра", "Зварот Льва Сапегі", "Прамова Мялешкі", "Энеіда навыварат", "Тарас на Парнасе"; называліся агулам "творы антычнай літаратуры", "на старабеларускай і лацінскай мовах", "творы гістарычнай тэматыкі" і нават "произведения более чем на 150–200 страниц". Мяркуйце самі...

3. Не хапае ў падручніках фотаздымкаў ды ілюстрацый да літаратурных твораў.

4. Я лічу, што матэрыял у падручніку павінен мець практычны характар, не толькі змяшчаць інфармацыю, але і вучыць: аналізу, крытыцы, адказнасці за свае словы. Поўны і ўсебаковы разгляд таго ці іншага твора (гэта датычыць у першую чаргу падручнікаў для старэйшых класаў) у чымсьці пазбаўляе вучня жадання і мажлівасці сур'ёзна і глыбока разважаць самастойна, выказваць уласную думку. Менш гатовых фармулёвак, больш практычных заданняў (пытанняў на роздум, абмеркаванне, а таксама звязаных з літаратурным і псіхалагічным аналізам) – тады, магчыма, працэс навучання стане сапраўды дзейсным і творчым. Адносна стылю падручнікаў, то мяне ўласна ён поўнасцю задавальняе: дастаткова навуковы, даволі мастацкі.

Калаж В. Калініна і А. Смаляка

І хаця гісторыя тэлебачання пачалася амаль 80 гадоў таму, толькі ў 1996 годзе Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый прызнала яго надзвычай важнае значэнне ў жыцці чалавецтва і ўрачыста абвясціла 21 лістапада Сусветным днём тэлебачання. Тым самым была падкрэслена дзейснасць гэтага сродку масавай інфармацыі ў справе пошуку ўзаемаразумення паміж народамі, захавання культурнай спадчыны і духоўных каштоўнасцяў. Разам з тым, ААН звярнула ўвагу на неабходнасць глабальнага абмену тэлевізійнымі праграмамі, прысвечанымі бяспецы, эканамічнаму і сацыяльнаму развіццю, захаванню міру, пашырэнню культурных стасункаў. Для вырашэння гэтай задачы магчымасці нацыянальных і прыватных тэлекампаній аказаліся надта абмежаванымі. Але прынятае ААН рашэнне не сталася прадвесцем з'яўлення адмысловых міжнародных інфармацыйных структур. Яны ўжо існавалі...

АГУЛЬНАЯ ТЭРЫТОРЫЯ



Яшчэ ў кастрычніку 1992 года кіраўнікамі васьмі краін — Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана і Узбекістана было падпісана Пагадненне аб стварэнні Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі "Мир". Так на постсавецкай прасторы нарадзілася унікальная інфармацыйная структура, якая павінна была прадстаўляць інтарэсы ўсіх яе ўдзельнікаў і забяспечыць права кожнай з незалежных дзяржаў на аб'ектыўную інфармацыю аб жыцці сваіх народаў, культуры, нацыянальных і рэлігійных звычаях.

Гэта толькі здаецца, што нас яднае выключна тое, чым мы падобныя. А цікавыя мы адзін аднаму якраз тым, чым адметныя. І калі кожны захавае сваё, то гэта сваё становіцца агульным набыткам.

У 2003 годзе МТРК "Мир" упершыню з'явілася на хвалях уласнага тэлеканала, а з лета 2004 года яе штодзённая прысутнасць у эфіры склала ўжо 18 гадзін. Сёння тэлекампанія "Мир" — гэта 11 нацыянальных прадстаўніцтваў і філіялаў у краінах Садружнасці, больш як 500 супрацоўнікаў і каля 150 мільёнаў гледачоў.

У Беларусі вяшчанне Міждзяржаўнага тэлеканала "Мир" пачалося 25 снежня 2004 года, а са студзеня 2005 года праграмы тэлекампаніі пачалі трансліравацца па мінскіх кабельных сетках. Больш за 10 гадоў існуе студыя тэлебачання Прадстаўніцтва тэлерадыёкампаніі ў Беларусі. Як прадстаўлена наша краіна ў межах гэтай глабальнай тэлевізійнай структуры і што думаюць пра сваю працу тыя, хто стварае імідж нашага земляка і сучасніка? Адказаць на гэтыя пытанні пагадзіўся галоўны рэдактар студыі тэлебачання Прадстаўніцтва МТРК "Мир" у Рэспубліцы Беларусь Юрый БОКАЧ.

— Наколькі істотны ўдзел беларускага прадстаўніцтва ў тэлеканале?

— Сёння мы ўваходзім у праграму тэлеканала пэўнымі часткамі агульных праграм (сюжэтамі), якія робяцца прадстаўніцтвамі і збіраюцца ў Маскве. Гэта такія праграмы, як "Навіны Садружнасці", штотыднёвая інфармацыйна-аналітычная праграма "Разам", маладзёжны музычны "Хіт-экспрэс", забаўляльная праграма "Чамадан гісторый". Ёсць праграма "Акцэнты", у якой узнімаюцца так званыя "гарачыя тэмы". Яна — не толькі рэакцыя на пэўныя падзеі, але і іх аналіз. Некаторыя праграмы рыхтуюцца ў форме тэлевізійных мастоў. Напрыклад, ток-шоу "Спрэчная тэрыторыя", якое з'явілася ў эфіры 1 верасня. У маскоўскай студыі знаходзяцца вядучы, група журналістаў і герой праграмы. У Мінску таксама збіраюцца яе ўдзельнікі, і тэлевізійны мост дае магчымасць чуць адно аднаго, задаваць пытанні, спрачацца, вызначаць розныя падыходы да ўзнятай праблемы.

— Усё гэта так званыя кансалідаваныя праграмы... Але існуюць яшчэ і праекты, якія вы робіце выключна сваімі сіламі.

— Самастойна мы рыхтуем чатыры штотыднёвыя праграмы: "Кірава, 17", "Як маецеся?", "Мільён пытанняў аб прыродзе" і "Дом, які...". "Кірава, 17" — гэта праграма, назва якой вызначана адрасам Выканаўчага камітэта краін СНД. Але мы расказваем не толькі пра пасяджэнні і пастановы, а імкнёмся паказаць, як прынятыя рашэнні выконваюцца і які адбітак маюць у жыцці кожнага чалавека.

— Каму адрасавана "Кірава, 17"?

— У меншай ступені тым, хто падпісвае пастановы. Скажам, чарговая праграма прысвечана праблемам бежанцаў. Іх даволі многа ў краінах Садружнасці, ды і нашы людзі едуць за мяжу, каб нешта зарабіць. Якія ў іх правы, абавязкі, магчымасці? Гаворка ідзе пра гэта. Прычым, зыходзячы з лёсу канкрэтных людзей, без нейкіх абстрактных разваг аб тым, якія існуюць законы ў розных краінах і як гэтыя законы суадносяцца паміж сабой. Агульныя развагі, я думаю, нікому не цікавыя...

— Міждзяржаўны тэлеканал — гэта унікальная магчымасць пабачыць цэлую галерэю партрэтаў нашых сучаснікаў, параўнаць сябе з іншымі. Сучасны беларус... які ён?

— Герой нашай праграмы «Як маецеся?» («Как живете-можете?») — чалавек з правінцыі, які шукае сваё месца ў сённяшнім няпростым жыцці. Гэта людзі самых розных прафесій. Эдуард Жукоўскі — повар з Ружанаў, які стварыў уласнае кафэ пры дарозе. Віктар Радкевіч і Уладзімір Раго — канструктары, якія пачалі вырабляць усюдыходы з самых нечаканых рэчаў: з разбітых машын, самалётаў і ўсяго таго, што знаходзілі пад плотам... Яны стварылі нават сваю адмысловую лабараторыю, і неўзабаве з'явіліся заказы на іх вырабы... Віктар Шышко — фокуснік з Магілёва. Яго ведаюць і чакаюць у дзіцячых садах і школах, бо ён, як ніхто іншы, умее прыўнесці свой адмысловы святочны настрой... Альбо шапавалы з вёскі Цёмны лес Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці. Яны стварылі сваю тайную беларускую мову — дрыбінскіх шапавалаў. Вельмі дзіўную і непаўторную. Называецца яна — Катрушніцкі лямязень. Адным словам, усе нашы героі — па-сапраўднаму цікавыя сваімі справамі...

— Не сакрэт, што для стварэння відовішчных праектаў патрабуюцца дадатковыя фінансавыя ўкладанні...

— Безумоўна. Ёсць у нас праграма "Мільён пытанняў аб прыродзе", якую робіць кандыдат біялагічных навук Ігар Бышнёў — аматар прыроды і выдатны тэлеаператар. Ён назірае за прыродай у Бярэзінскім запаведніку, дзе жыве і працуе. Натуральна, што для стварэння такой праграмы патрэбны грошы на камандзіроўкі, бензін, ды і здымаць трэба цэлы тыдзень. Усё гэта мы можам сабе дазволіць, дзякуючы дапамозе Міністэрства прыродных рэсурсаў, якое з'яўляецца спонсарам і зацікаўлена, каб мы рабілі адметную праграму...

— ...І разам з тым, даступную шырокаму колу гледачоў. Як і праект "Дом, які...", прызначаны для сямейнага прагляду.

— Праграму "Дом, які..." ("Дом, который...") мы задумвалі пабудаваць, як звычайны дом, а яе рубрыкі — адпаведна назвам пакояў: дзіцячы, майстэрня, кухня і г.д. Мы хацелі звярнуць увагу кожнага на ўласны дом і абудзіць жаданне зрабіць яго ўтульней.

— Тэлекампанія "Мир", па сутнасці, эфірнае ўвасабленне агульнага дома для многіх краін, якія рознятца палітычным ладам, укладам жыцця, культурным узроўнем. Як зрабіць гэты дом утульным? Як знайсці універсальную, зразумелую ўсім мову?

— Я думаю, што не існуе такой агульнай мовы, як і заўсёдных агульных падыходаў. Тая ж маладзёжная праграма "Хіт-экспрэс"... Шчыра прызнаюся, мае калегі неяк абвострана ўспрынялі манеру яе вядзення, маладзёжны слэнг, але яна знайшла свайго гледача. Прычым, адгукаюцца людзі і з Расіі, і з Арменіі, і з Грузіі, і з Таджыкістана. У кожнага свае падыходы, свае ацэнкі, свой менталітэт, але ўсе гэтыя краіны прысутнічаюць у праграмах: гучаць іх песні, з'яўляюцца і іх выканаўцы. Мне здаецца, можна зразумець адно аднаго, калі ёсць такое жаданне. А як зрабіць, каб было зразумела ўсім? Відаць, разам.

— Што найбольш цікавіць гледачоў з розных краін — чым мы падобныя ці чым адметныя?

— І чым падобныя, і чым адметныя. Гэта толькі здаецца, што нас яднае выключна тое, чым мы падобныя. А цікавыя мы адзін аднаму якраз тым, чым адметныя. І калі кожны захавае сваё, то гэта сваё становіцца агульным набыткам.

— Як, напрыклад, ваш фільм "Дзед Максімыч, "Чырвоны партызан" і тры мяжы", які на сёлетнім Міжнародным тэлекінафоруме ў Сочы зацікавіў многіх і атрымаў прыз "За лепшы спецыяльны рэпартаж".

— Гэта работа журналіста Дзмітрыя Андрушына, аператара Дзмітрыя Сямагі і відэаінжынера Сяргея Кандруцкага. Здымкі мы рабілі на тэрыторыі, дзе мяжуюць Беларусь, Украіна ды Расія і распавялі пра тое, як жывуць там людзі, якія ў іх праблемы, спадзяванні, мары.

— Як высветлілася, вельмі розныя. Не зважаючы на тое, што жывуць людзі побач...

— Так. У кожнага свая філасофія, свая праўда, свой светапогляд. Зрэшты, тым мы і багатыя, што ў нас такое рознае светаадчуванне.

Уладзімір ДАВЫДОЎСКІ

Фота аўтара

На здымках: відэаінжынер Сяргей Фуртас і галоўны рэдактар студыі тэлебачання Прадстаўніцтва МТРК "Мир" Юрый Бокач, у студыі відэамантажу — Васіль Жыткевіч, рэжысёр і вядучая праграмы "Дом, які..." Наталля Баярынцава (злева).



17 лістапада адзначаўся Дзень філасофіі ў ЮНЕСКА

Магчымасць ідэальнага

Дзякуй ЮНЕСКА: побач з днямі дэсантнікаў і медыцынскіх работнікаў, дажынкамі і Восьмым сакавіка ёсць Дзень філасофіі. Нічога, што ў календары не адзначаны. Нехта разумны абраў для яго цудоўны час, калі прырода перад непазбежным высілкам перамагчы зімнюю тугу марознай весялосцю замірае на імгненне, быццам азіраецца, каб усвядоміць сябе: без покрыва лісця ці снегу, без раскошаў спякоты ці халоднай узнёсласці. Так азіраецца на сябе чалавек, шукаючы — чаго? Апраўдання? Альбо імпэту? І пачынаецца філасофія.

У розных абліччах паўстае яна, але ў кожным беспамылкова пазнаецца, бо больш нідзе найвышэйшая сапраўднасць не належыць пытанню. Хто я? Дзеля чаго надыходзіць новы дзень? Што ёсць свет і які ён павінен быць? Тысячагоддзямі назапашваюцца адказы. А пытанні застаюцца. Філасофія — мысленчая засяроджанасць свету і прастора чалавечага, самы глыбокі і самы адважны складнік культуры.

У Беларусі філасофію ўжо аднойчы адмянялі. Як было проста і неаспрэчна даведзена ў пастанове Прэзідыума Акадэміі навук — "закрыць Інстытут філасофіі ў сувязі з немэтазгоднасцю". Незнішчальная, як і ўся культура, філасофія паўстала і аднавілася, не пакінула нашыя душы сам-насам з сіроцкім светам адзіна правільных адказаў. Вярнулася, як вяртаецца-аднаўляецца культура пасля жорсткіх сацыяльных катаклізмаў, калі не разгубленасцю і вытанчанасцю — клінком і полымем знішчаюцца носьбіты культуры, здаецца — дарэшты, але ж мінаюць якія дваццаць—трыццаць—пяцьдзесят гадоў, імгненне ў бегу вечнасці, і адкуль толькі бяруцца зноў пяшчотныя, хісткія, бледныя парасткі таго, што павінна быць. Ідэалаў. Асэнсаванняў. Бессмяротнасці.

Аднак бессмяротнасць культурнага — чалавечая: жыццё культуры здзяйсняецца не ў аб'ектыўнасці, а ў розуме і справах канкрэтнай асобы. Недасканалай, слабай, самотнай, але непаўторнай. Вядома, культура звычайна ўвасабляецца ў нейкіх матэрыяльных рэчах, іх уласцівасцях, формах, сувязях, але ж яе аб'ектамі выступаюць не самі гэтыя рэчы, а ўнесеныя ў іх ідэальныя асновы, сэнсы, каштоўнасці. Ніякага іншага жыцця культуры не існуе. Культура "размаўляе" чалавечай мовай, "бачыць" чалавечым позіркам і "плача" чалавечымі слязамі. Калі забраць ад культуры чалавека, яна загіне — тут, зараз і назаўсёды. Культура не здольная існаваць без чалавека. Каб чалавек здолеў быць культурай, патрэбна філасофія.

Бадай, для малой краіны мець шматгаліновую навуку — немагчымая раскоша. Можа, сапраўды, філасофія павінна саступіць месца практычным і карысным канкурэнтам? Ці ёй належыць якая-небудзь незаменная роля? Дзеля чаго існуе яна як непаўторнае спалучэнне строгай рацыянальнасці і вытанчанай узвышанасці?

Як асобны чалавек, усведамляючы належнае, тое, што павінна быць так, а не іначай, набывае годнасць — гэтаксама і грамадства цалкам стварае сваю годнасць у сферы самасвядомасці, выпрацоўваючы чыстую нарматыўнасць. Такая "звышсвядомасць", асэнсаванне асабістых сэнсаў абапіраецца ў першую чаргу на філасофскае мысленне як важнейшы складнік. Функцыя яго вельмі простая: *быць эталонам*. Замяніць філасофскае абагульненне і глыбіню ў якасці ўзору нарматыўнага, належнага няма чым, бо філасофія ёсць самая развітая форма самасвядомасці грамадства. Ці выконваецца гэтая функцыя, можна меркаваць па двух крытэрыях: першы — нараджэнне новых ідэй, крэатыўнасць духоўнага быцця (дарэчы, незалежна ад маштабнасці); другі — захаванне і ўзнаўленне пласта вярхоўнай, чыстай ідэальнасці, існаванне якой прынцыпова важнае для здаровай структуры свядомасці і якая сваім зместам і сваімі носьбітамі забяспечвае саму магчымасць каштоўнасных арыентацый.

Другая функцыя, не менш істотная, — неабходнасць інтэграцыйных асноў культурнага развіцця. Філасофія выступае тут як элемент спалучэння, магчыма нават, кампліментарнасці, на якім будуецца сацыяльная і *культурная ідэнтычнасць*. Відавочна, што гэтая роля не абмяжоўваецца ўдзелам у выпрацоўцы ідэалогіі, як падаецца часам не надта дасведчаным кіраўнікам. У выкананні гэтай функцыі адзін з уплывовых фактараў — сумяшчальнасць праблематыкі даследаванняў з рухам сучаснай сусветнай філасофіі, актыўны навуковы абмен.

У тым жа шэрагу сістэмных, падмуркавых задач філасофіі — узаемадзеянне з іншымі формамі свядомасці, уласна-навуковыя функцыі, уздзеянне на фарміраванне і функцыянаванне каштоўнасцей, тое, што можна назваць функцыяй *інкультурацыі грамадства*, павышэння долі прысутнасці ў рэальным жыцці ідэальнага, духоўнага. Пра паспяховасць выканання гэтай ролі сведчыць статус філасофіі ў грамадстве, якому адпавядае інстытуцыянальны крытэрый: даступныя віды работ (вакансіі) па філасофіі.

Звычайна, найбольш вядомая функцыя — апошняя ў нашым разглядзе – *адукацыйная*: філасофія не толькі выступае часткай адукацыйна-выхаваўчай палітыкі грамадства ў адносінах да асобы, але і аказвае вырашальны ўплыў на фарміраванне гэтай палітыкі. На жаль, мэты, якія афіцыйна прымаюцца сёння пры вывучэнні філасофіі, не адпавядаюць яе прыродзе. Зразумела, як навука філасофія абапіраецца на пэўныя веды, але як фактар развіцця чалавечай асобы яна паўстае спосабам мыслення, здольнасцю праблематызацыі, пошукам. Эфектыўнасць гэтай функцыі забяспечваецца не праграмамі, а выключнасцю асабістага ўплыву выкладчыкаў, прывабнасцю чалавечай мудрасці.

Цікава, ад якой з названых функцый можна адмовіцца? Аднак, у той ці іншай ступені, кожная з іх у айчыннай сучаснасці нясе прыкметы заняпаду. Спробы рэфармавання, якія адбываюцца ў апошнія гады, нагадваюць старажытную Спарту: хто вытрывае ва ўмовах немагчымасці, будзе добрым ваякам. Аднак у Дзень філасофіі з'яўляецца спакуса загадаць — па-навагодняму — жаданне. Вялікае, але ж адно на ўсіх. Каб паспрыяць развіццю тых якасцей і функцый філасофіі, якія выступаюць для грамадства прыярытэтнымі, трэба вызначыць эвалюцыйныя тэндэнцыі і знайсці сродкі змянення верагоднасці ў іх працяканні. Ні за пяць, ні за дзесяць год нельга атрымаць вынікі самастойнага значэння, але можна спадзявацца на фарміраванне нейкіх вузлавых момантаў, "зёрнаў" будучых перамен.

Каб павысіць узровень творчасці, неабходна механічнае нарошчванне прасторы даследаванняў: павелічэнне колькасці тэкстаў, разнастайнасці тэматыкі, з'яўленне новых элементаў інфраструктуры абмену ідэямі. Творчасць прывабная сама па сабе, але патрабуе фізічнай магчымасці інтэлектуальнага "вольнага часу", духоўнай засяроджанасці; сёння ж большасць патэнцыяльных аўтараў выкладае ў ВНУ і ледзь паспявае перабягаць з адной аўдыторыі ў другую. Выдавецкая палітыка, якая канчаткова зарыентавалася на выданне кніг за кошт аўтараў ці інстытутаў, павінна ўсталёўваць сувязі паміж новымі ідэямі і чытачамі. Можа, тады ўдасца не толькі ўратаваць прафесіяналаў, што здолелі выжыць, але і спадзявацца на выхаванне і прафесійны рост моладзі.

У фарміраванні праблематыкі ёсць сэнс адмовіцца ад вялікіх праграм даследаванняў, арыентаваных на ўсёахопнасць. Калі абапірацца на рэальныя новыя працы, персанальныя інтэнцыі і магчымасці тых, хто стварае новыя ідэі, верагоднасць перспектывы развіцця значна павысіцца. Незалежнае значэнне ў філасофіі маюць не толькі "буйныя", але і лакальныя, асобныя праблемы і рашэнні. Менавіта з іх паўстаюць новыя кірункі. Быццё сучаснае іх ігнаруе, але ў мары... яны могуць нават атрымаць дзяржаўнае фінансаванне!

У сістэме адукацыі галоўным кірункам зрабілася б адмаўленне ад "безасабовасці". У ідэале асноўная адукацыйная дзейнасць трансфармуецца ў бок выкладання спецыяльных курсаў той праблематыкі, у якой выкладчык дасягнуў пэўных вынікаў як даследчык; тут спатрэбіцца стварэнне агульнай сістэмы конкурснага адбору і зацвярджэння спецкурсаў, абмену лектарамі і экспертамі, сістэматычнага абнаўлення вучэбных планаў.

Наўрад ці можна вызначыць, якая філасофія найбольш карысная для грамадства. Затое відавочна, што самае шкоднае — яе адсутнасць. Застаецца выбіраць з усёй рэчаіснасці тое, што вызначаецца якасцю асэнсавання, і ствараць для яго спрыяльныя ўмовы: ці то будуць асобныя мысляры, ці то кніжныя серыі, часопісы, дыскусіі.

Чалавек, які суіснуе з такой філасофіяй, змяшчае культуру ў сабе — як ідэал свайго ўнутранага свету. Адначасова, аднак, ён належыць культуры — як момант яе руху, як недасканалая праява. Так увасабляецца унікальнасць чалавечага быцця ў свеце: ствараць магчымасць ідэальнага.

Таццяна МІЛОВА

НАТХНЕННЕ ДОРЫЦЬ ЛЕС

У Рэспубліканскім вучэбным цэнтры Міністэрства лясной гаспадаркі звычайна павышаюць сваю кваліфікацыю лесаводы. Гэтым разам у Ждановічах прымалі школьнікаў і навучэнцаў прафтэхвучылішчаў — фіналістаў чацвёртага творчага экалагічнага конкурсу "Квітней, мой лес!".

З прывітаннем да іх звярнуліся міністр лясной гаспадаркі Пётр Сямашка і намеснік старшыні пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстання Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Алена Скрыпко. А затым адбылася абарона лясных экалагічных праектаў і выступленні тэатральных калектываў з пастаноўкамі на лясную тэматыку. У фае была разгорнута выстаўка малюнкаў і плакатаў. А вось з літаратурнымі творамі, дасланымі на конкурс (іх, дарэчы, было каля 250), члены журы пазнаёміліся загадзя.

У намінацыі на лепшае апавяданне або верш, прысвечаныя лесу, перамог вучань Стралкоўскай базавай школы Верхнядзвінскага раёна Аляксей Бондар. Другое месца заняла Кацярына Беразоўская (СШ № 13 г. Мінска), на трэцім — Аляксандр Кавалеўскі з в. Руднікі Капыльскага раёна.

Лепшымі мастакамі названы Жана Шчыглеўская з г. Бяроза, Ганна Хімкова з Наваполацка, мінчанка Юля Мацвеева і Наталля Янкоўская з Лагойска.

Сярод пераможцаў у намінацыі "Лясны тэатр" — гурток СШ № 38 г. Магілёва і школьнае лясніцтва Даўжанскай СШ Віцебскага раёна, калектывы пры Доме творчасці Асіповіцкага завода аўтамабільных агрэгатаў і Бярозаўскага ГПТВ № 109 будаўнікоў.

Усе яны атрымалі падарункі, якія выдзелілі для заахвочвання пераможцаў міністэрствы лясной гаспадаркі і адукацыі, Беларускае таварыства лесаводаў, Мінскі гаркам БРСМ, прадстаўніцтвы фірм "Штыль", "Хускварна", "Тыгер" і іншыя.

Анатоль ЗЭКАЎ

СТАРАСЦЬ — НЕ ЗАЎСЁДЫ РАДАСЦЬ...

Прыемна ўсведамляць, што ёсць вакол людзі, якія маюць вельмі шаноўны ўзрост і пачуваюць сябе. Рухаюцца, яшчэ ў меру сіл працуюць, маюць ясны розум, самі сябе даглядаюць. Гэта натхняе жыць, упэўнена глядзець у сваю будучыню. Адным словам, і ў нас нямала людзей, каму ўжо за 100 гадоў. Іх, даўгажыхароў, больш як 800.

90 працэнтаў — гэта жанчыны. Самыя сталыя па ўзросце — таксама асобы жаночага полу: мінчанка Ганна Адамаўна Барысевіч і Аляксандра Якаўлеўна Акасотка са Століншчыны. Ім па 117 гадоў. Ганне Паўлаўне Рагель з Маладзечна — 116. Найбольш беларускіх «аксакалаў» жыве на Гродзеншчыне (191), на Міншчыне (159) і на Віцебшчыне (129). Дадамо новыя звесткі па Беларусі, а таксама некаторых краінах Еўропы. «Маладой» дзяржавай, на думку вучоных, лічыцца тая, дзе сталых людзей старэй за 65 гадоў — 4 працэнты насельнікаў, «старэючай» — ад 7 працэнтаў і больш. У Германіі і Вялікабрытаніі пажылы люд складае больш як 15 працэнтаў, у Швецыі — 19, у Японіі — каля 20. З аднаго боку, добра, калі старэйшаму пакаленню ўсебакова забяспечана іхняя старасць, а з другога — трывога грамадскасці за сваю будучыню. Многія еўрапейскія краіны не толькі шукаюць маладыя рабочыя рукі са слабаразвітых краін, але і грунтоўна распрацавалі і ажыццяўляюць свае дэмаграфічныя праграмы росту колькасці карэнных насельнікаў.

Як паведамляе статыстыка, цяпер у Беларусі прыкладна 9,85 мільёна чалавек, з іх пажылых — 2,08 мільёна. Значыць, іх амаль 21 працэнт. Да 2020 года колькасць можа павялічыцца да 28 працэнтаў. Гэтая тэндэнцыя, безумоўна, не можа не быць у цэнтры ўвагі нашага грамадства, урада: па-першае, ужо сёння ў многіх галінах народнай гаспадаркі пенсіянеры ў разліку на 100 работнікаў складаюць амаль 60 чалавек, а падругое, штогод (удумаемся, землякі, штогод!) у нас на 40—50 тысяч больш памірае, чым нараджаецца. Штогод (!) знікае цэлы горад! Вучоныя перасцерагаюць: пры такім становішчы і надалей праз гадоў 150—180 у Беларусі можа не застацца ніводнага беларуса! Дай Бог, каб гэтага не здарылася, але і цяпер ужо трэба клапаціцца, рабіць усё магчымае, каб прадухіліць гэты працэс. Калі мы гаворым пра бяспеку дзяржавы, захаванне народнага этнасу, старажытнай нацыі, то ніяк нельга пускаць справу на самацёк.

Вывучана здаўна: грамадства, якое няўхільна старэе фізічна, — нерашучае, пранікаецца кансерватызмам, баіцца рызыкі і эксперыментаў, а ў выніку пачынае адставаць ад іншых краін у эканамічна-культурным развіцці і, адпаведна, у дастатку, гібее. Зусім невыпадкова, што сёння ў многіх нашых маладых сем'ях, не толькі гарадскіх, але і сельскіх, толькі па двое дзяцей, а то і па адным нашчадку, а ў некаторых з-за кватэрных умоў і малых заробкаў — іх няма ўвогуле. У нас вельмі шмат разводаў, нямала маладых цяжарных жанчын пазбаўляецца ад дзіцяці. Шмат сірот (ці не больш за 30 тысяч), і многія з іх не зусім фізічна і псіхічна здаровыя. Што да «пастарэння» грамадства і звязаных з ім турбот, то з гэтай праблемай найлепш спраўляецца Швецыя, дзе, па-першае, для пажылых людзей створаны адпаведныя ўмовы, пры якіх пенсіянеры зацікаўлены працаваць там, на што яшчэ дастаткова хапае ў іх сілы і ведаў, па-другое, для іх існуюць падатковыя і іншыя льготы.

Нельга сказаць, што вышэйзгаданыя клопаты ў нас не падымаліся. Час ад часу гучаць. Але ці ёсць у нас прадуманая і разлічаная на далёкую перспектыву дэмаграфічная праграма? Ці мы, радавыя насельнікі нашай краіны, уяўляем яе як след? Ці па-сапраўднаму закранаецца яна яшчэ з дзіцячага садка, школы? А потым і ў ВНУ? Ці хопіць адміністрацыйных мер прыцягнуць да адказнасці бацькоў, якія адмаўляюцца гадаваць сваіх дзяцей, перакладаючы гэту праблему на плечы дзяржавы? Ці дастаткова для павышэння нараджальнасці, скажам, у вёсцы, абавязаць кожную гаспадарку пабудаваць некалькі новых дамоў для маладых сем'яў?

Альбо ці будзе чакаць тую ж вёску светлая будучыня, калі з многіх сённяшніх параскіданых і неўладкаваных вёсак абсталяваць ці не 3 тысячы аграгарадкоў? Ці зазвіняць яны дзіцячымі галасамі? Аграгарадкі (перспектыўныя вёскі), што добра ў маёй памяці, — гэта зварот да ідэі, ініцыятарам якой гадоў 30 таму з'яўляўся тагачасны першы сакратар ЦК КПБ Пётр Машэраў. Як помніцца, у той час ён марыў прыкладна з 30 тысяч нашых вялікіх і «неперспектыўных» вёсак абладзіць менавіта каля трох тысяч «сельскіх пабудоў новага тыпу», што наблізілі б іх і іхні люд да камунізму. Тады тая ідэя павісла ў паветры з-за кансерватызму старажылаў ЦК КПСС—СССР, якія звыкліся «царствовать лёжа на боку», з-за малавыдзеленых на нашу рэспубліку сродкаў і, на жаль, з-за нечаканай гібелі П. Машэрава. Ды і ў народзе, сярод інтэлігенцыі (сярод нас, пісьменнікаў, таксама) не ўсе з радасцю ўспрынялі тую ініцыятыву: яна карэнна ламала вёску са старажытным укладам, яе звычаі і абрады, самабытную вясковую матэрыяльна-духоўную культуру. Тым больш, што вёска яшчэ і ў часы П. Машэрава была пераважнай падпіткай беларускай мовы, нацыі. За апошнія 30 гадоў сітуацыя ў нашых вёсках не проста змянілася, а значна пагоршылася: многія вёскі пачалі чэзнуць, з іх паступова знікалі і працягваюць знікаць сярэднія, базавыя, пачатковыя школы, яслі і садкі, амбулаторыі, камбінаты бытавога абслугоўвання, крамы «Товары повседневного спроса», фермы. Заняпалі, збяднелі гаспадаркі... А яшчэ чарнобыльская бяда з яе комплексам матэрыяльна-духоўных пытанняў... Многія вёскі абязлюдзелі, пусцеюць; у многіх рэзка пахіснулася мараль, развілося да небяспечных памераў п'янства — адпаведна, справа адраджэння беларускай вёскі будзе вельмі і вельмі нялёгкая. Ды брацца за яе ўжо жыццёва неабходна. Усёй грамадою.

Генрых ДАЛІДОВІЧ

Захаваецца памяць

Сёлета ў сярэдняй школе № 2 г. Маларыта, дзе дырэктарам працуе ўлюбёная ў сваю справу Любоў Куц, вырашылі стварыць галерэю мастацкіх партрэтаў людзей, якія пакінулі значны след у гісторыі гэтага краю. За такую нялёгкую і складаную справу ўзяўся мясцовы мастак Сяргей Бескаравайны пасля таго, як адбылася яго персанальная выстава, прысвечаная 60-годдзю Вялікай Перамогі.

Сяргей Аляксандравіч ужо напісаў партрэт былога старшыні калгаса "Запаветы Леніна" (цяпер сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў "Хаціслаўскі") Леаніда Ляонава, які амаль 50 гадоў запар узначальваў гэтую перадавую гаспадарку. У свой час Леанід Іванавіч быў узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, "Знак Пашаны".

Партрэт Рыгора Тарабчука, які не адно дзесяцігоддзе адпрацаваў у Маларыцкай перасоўнай механізаванай калоне № 8, — таксама работа мясцовага мастака. Дарэчы, гэты паважаны чалавек мае ганаровае званне заслужанага меліяратара БССР, у свой час быў узнагароджаны ордэнамі Леніна і шматлікімі юбілейнымі медалямі. Ён і цяпер працягвае актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці нашага райцэнтра: Рыгор Іосіфавіч спявае ў гарадскім хоры ветэранаў.

На мой погляд, удаўся мастаку і партрэт Генрыха Кандановіча, кандыдата сельскагаспадарчых навук, былога галоўнага агранома калгаса "Перамога". Дарэчы, яго старанная праца ў гаспадарцы адзначана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Але партрэтамі перадавікоў вытворчасці не абмяжоўваецца ў сваёй творчасці Сяргей Аляксандравіч. Улічваючы тое, што ў Маларыцкім раёне вялікая ўвага надаецца прапагандзе здаровага ладу жыцця, заняткам фізкультурай і спортам, ён з асаблівым натхненнем узяўся і за гэтую тэматыку. Мастак ужо напісаў партрэты алімпійскага чэмпіёна Леаніда Тараненкі, тутэйшага ўраджэнца, спартыўныя дасягненні якога і цяпер уражваюць; Пятра Пачэнчука, алімпійскага прызёра па спартыўнай хадзьбе (нарадзіўся ў Маларыцкім раёне); і, вядома ж, нашай зямлячкі з Брэста — Юліі Несцярэнкі, алімпійскай чэмпіёнкі па лёгкай атлетыцы.

Цяпер творца піша партрэты людзей, якія ўзнагароджаны ордэнамі Леніна, а таксама тых, чые працоўныя дасягненні адзначаны двума ці больш ордэнамі. Сяргею Бескаравайнаму, трэба сказаць, удаецца перадаць душэўны стан чалавека, паказаць яго як асобу.

Запамінальны партрэт Аляксандра Болдырава — ваеннага разведчыка, удзельніка Курскай бітвы, кавалера двух ордэнаў Чырвонай Зоркі.

Яшчэ ў пачатку 80-х гадоў Сяргей Бескаравайны напісаў акварэллю серыю партрэтаў знакамітых людзей, лаўрэатаў розных прэмій і нават Нобелеўскай, у прыватнасці, Міхаіла Шолахава. Сярод іх былі і вядомыя на ўвесь свет мастакі і кампазітары.

Працяглы час творцу ведалі ў Маларыце як мастака па камяні. Сёння ён пераважна піша карціны алеем. А наогул, мастакоў, якія могуць ствараць партрэты, не надта ўжо і шмат. Сяргею Аляксандравічу, як бачна, удаецца ўлавіць тыя рысы, якія дакладна характарызуюць чалавека.

Віталь МІГАЛЕВІЧ

ЗАХАРАВА, 19

Пішыце на адрас: 220005, Мінск, вул. Захарава, 19, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва";
e-mail: minsk@lim.by
Адрас у Інтэрнеце — www.lim.by

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва»

— прымае да разгляду выдавецкія праекты самай шырокай тэматыкі;
— выканае ўвесь спектр рэдакцыйна-выдавецкіх паслуг;
— арганізуе рэкламу і прэзентацыю выданняў.

Вул. Захарава, 19,
тэл.: 284-79-65

Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць № 02330/0056810 ад 2 сакавіка 2004 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Кнігі можна набыць у Рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва". Тэлефоны аддзела маркетынгу і рэкламнай дзейнасці: 284-79-65; (факс) 284-82-04.

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва; рэдакцыя газеты "ЛіМ" глыбока смуткуюць з прычыны смерці заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь, акадэміка НАН Беларусі, доктара філалагічных навук, прафесара Аляксандра Іосіфавіча ПАДЛУЖНАГА і выказваюць шчырае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

У адным доме

Будзённым надвячоркам адкрыліся, з разбежкай у гадзіну, дзве зусім не падобныя між сабой фотавыстаўкі, размешчаныя ў суседніх залах Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі. Акалічнасць, можна сказаць, метафарычная: іх пасялілі ў адным доме, на агульнай пляцоўцы, дзверы ў дзверы. Блізкае і добрае суседства такіх розных герояў і тыпажоў, вобразаў і адухоўленых рэчаў спрыяла больш тонкаму, удумліваму знаёмству з экспазіцыямі. Адна з іх — "Русь. Веси. Грады. Лики. Земля" — прадстаўляла творчасць знанага кінааператара, рэжысёра, фотамайстра, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі і Расійскай Федэрацыі Анатоля Забалоцкага. Разам з нашым рэжысёрам В. Туравым ён зняў кінаапавед "Праз могілкі", уключаны ЮНЕСКА ў спіс 100 лепшых стужак пра вайну. У супрацоўніцтве з В. Шукшыным стварыў незабыўныя "Печкі-лавачкі", "Каліну чырвоную". Яго маштабныя фотапалотны, паказаныя мінчукам, уразілі размахам жыццёвай панарамы, спалучэннем радаснай шчодрасці прыроды, яе неабдымных прастораў, ад якіх аж дух перахоплівае, і — непазбыўнай жаласлівай "рускай слязы". Выставачны праект А. Забалоцкага прымяркоўваўся да Года культуры Расійскай Федэрацыі ў нашай краіне.

Экспазіцыя ў суседняй зале сталася часткай праграмы фестывалю "Восень з польскай культурай", і склалі яе фота з фондаў Нацыянальнага музея ў Варшаве. Выстаўка, прапанаваная варшавянамі, расчуліла сваёй інтанацыяй, даверальнай і шчырай, нібы мелодыя настальгічнага рэтра. Кранула душы нашых землякоў сваёй беларускай сутнасцю, адлюстраванай і ў назве: "Культура беларускіх земляў на фотаздымках XIX ст.". Альтанка А. Міцкевіча і салон Э. Ажэшкі, пакоі радзівілаўскага замка і палац у Шчорсах, дагледжаныя падворкі, маляўнічыя прысады, самавіты тутэйшы люд... Архітэктурныя і ландшафтныя помнікі, бальшыню якіх не пашкадавала гісторыя, — нібы туга па рамантызме XIX ст. І ўсё гэта дзякуючы беларускім альбомам польскага фотамайстра Юзафа Барэці, здымкам Яна Садоўскага...

А здымкі, зробленыя падчас афіцыйнага адкрыцця выставак, адлюстравалі своеадметную падзею: Беларусь, Польшча, Расія ў адным доме — у агульнай прасторы культуры і творчасці.

С. БЕРАСЦЕНЬ

Фота К. Дробава



ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2006 ГОДА!

«Літаратура і мастацтва»
Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц —4000 руб.
на 3 месяцы — 12000 руб.
Ведамасная (індэкс — 638562)
на 1 месяц — 5200 руб.
на 3 месяцы — 15600 руб.
Льготная (індэкс — 63880)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 6 месяцаў — 25200 руб.

"Маладосць"
Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 3 месяцы — 12600 руб.
Ведамасная (індэкс — 749572)
на 1 месяц — 5200 руб.
на 3 месяцы — 15600 руб.
Льготная (індэкс — 00731)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 6 месяцаў — 25200 руб.

"Полымя"
Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 4000 руб.
на 3 месяцы — 12000 руб.
Ведамасная (індэкс — 749852)
на 1 месяц — 5000 руб.
на 3 месяцы — 15000 руб.
Льготная (індэкс — 00727)
на 1 месяц — 4100 руб.
на 6 месяцаў — 24600 руб.

"Всемирная литература"
Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 2 месяцы — 4500 руб.
на 4 месяцы — 9000 руб.
Ведамасная (індэкс — 748632)
на 2 месяцы — 5200 руб.
на 4 месяцы — 10400 руб.
Льготная (індэкс — 00729)
на 2 месяцы — 5000 руб.
на 6 месяцаў — 15000 руб.

"Нёман"
Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 4000 руб.
на 3 месяцы — 12000 руб.
Ведамасная (індэкс —749682)
на 1 месяц — 5000 руб.
на 3 месяцы — 15000 руб.
Льготная (індэкс — 00728)
на 1 месяц — 4100 руб.
на 6 месяцаў — 24600 руб.

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР

Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:

Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Уладзімір ДАВЫДОЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара)
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Інеса ПЕТРУСЕВІЧ
Ірына ШАЎЛЯКОВА
Наталля ЯКАВЕНКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-81-53
паэзіі, літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-81-53
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ". Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый. Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79

Індэкс 63856 Наклад 2901
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 30.11.2005 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 1419

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12